

МЕСЦЫ, ДЗЕ ЖЫВЕ МІНУЛАЕ 7

ПЕНСІЯ ЯК СВЯТА ЖЫЦЦЯ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 ЛІПЕНЯ 2022 г. СУБОТА № 133 (29755)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, Старшыня Палаты прадстаўнікоў:**

*«Законапраекты, якія былі ініцыяваны дэпутатамі, накіраваны на забеспячэнне бяспекі нашай краіны. Гэта ўвядзенне адказнасці за заклікі да санкцый, за ўдзел у дзейнасці незарэгістраваных палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, за акты тэрарызму. Акрамя таго, уведзены інстытут крымінальнага праследавання тых асоб, якія выехалі за межы Беларусі і адтуль вядуць антыдзяржаўную дзейнасць. Адказнасць за заклікі да санкцый — гэта ініцыятыва дэпутатаў, і на гэтым мы спыняцца не станем. Мы такую работу будзем працягваць і далей, таму што бяспека і стабільнасць — асновы нашай краіны. Калі мы працуем у выбарчых акругах, то чуем ад людзей, што галоўнае — гэта мір і бяспека».*

# Гаспадыня лавандавага поля



**Гэта не Праванс — гэта Беларусь. Такая вось прыгажосць квітнее зараз у Магілёўскім раёне, на дзялянцы ў Іны ЧУБІКАВАЙ. Вырошчваннем прыгожых кветак з дзівосным водарам жыхарка абласнога цэнтра занялася некалькі гадоў таму. Цяпер у яе цэлае лавандавае поле — дзве тысячы кустоў, з іх амаль палова красуе. Хараство! А ўжо які водар — можна толькі ўяўляць...**

**Фота БелТА.**

## КОРАТКА

- **Унікальную аперацыю дзіцяці з прыроджанай паталогіяй пазваночніка правялі ў Мінску.**
- Форум моладзі Магілёўскай і Бранскай абласцей праходзіць у Касцюковічах.
- **Культурныя канікулы: БРПА падрыхтавала для школьнікаў анлайн-экскурсіі па музеях і галерэях Беларусі.**
- Школу ваджэння на электрасамакатах арганізавалі ў Мінску.
- **Пытанні апекі і папячыцельства паўналетніх абмеркавалі ў Мінпрацы і сацабароны.**

Камунальныя стасункі

## ЦЯПЛО АД ТОРФУ, ШЧЭПАК І... ТРУБЫ

### Эксперты расказалі, што дае жыхарам замена трубаправодаў

Змяншэнне страт энерганосьбіту на трубаправодах і, адпаведна, затрат на дастаўку цяпла да спажыўца, а таксама надзейнасць цеплацсетак — дзве асноўныя задачы, якія павінны вытрымлівацца пры замене гэтых камунікацый, упэўненыя ў Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі. З існуючых больш як 15 тысяч кіламетраў цеплацсетак звыш 11 тысяч — заменена сучаснымі перадызаляванымі (ПІ-трубамі), а колькасць камунікацый са звышнарматыўным тэрмінам эксплуатацыі паменшана да 2,3 тысячы кіламетраў. Цеплаcтраты на трубаправодах пры гэтым зменшаны да дзевяці працэнтаў. Што рабіць для своечасовай і якаснай замены цеплацсетак у краіне і як знізіць расходы на выраб цеплаанасіцеляў, спецыялісты абмяркоўвалі на прыкладзе Міншчыны, а дакладней — Стаўбцоўскага раёна. СТАР. 4

Пазнай Беларусь

## «НА МЯДЗВЕДЗІ ЕДУ, ВОЎКАМ ПАДПІРАЮСЯ, А ВУЖОМ ПАДПЕРАЖУСЯ — ДЫ НІКОГА НЕ БАЮСЯ»

### Чым здзіўляе Палессе

«Ведаеце, хто такі паляшук? Гэта той, хто поле шукае», — часта гасцей беларускага Палесся сустракаюць такім пытаннем. А гасцям на Палессі рады, асабліва цяпер, калі ўнутраны турызм актыўна развіваецца. Некаторыя могуць запытацца, што там глядзець на тым Палессі. Паглядзець там ёсць што: адметная прырода, сем'і буслоў амаль на кожным даху, людзі з унікальным светапоглядам і канцэнтрацыя беларускай самабытнасці. А каб ні ў кога не ўзнікала падобных пытанняў, Нацыянальнае агенцтва па турызме арганізавала выязны семінар з прэзентацыяй турыстычнага маршруту «Да берагоў Гарыні і Прыпяці». «Звязда» ў баку не засталася.



СТАР. 12

ISSN 1990 — 763X

22133

9 771990 763008

# Высокі прафесіяналізм, кампетэнтнасць, прынцыповасць

**У краіне 10 ліпеня адзначаецца Дзень работнікаў падатковай службы**

**Работнікаў і ветэранаў падатковых органаў Беларусі павіншаваў з прафесіянальным святам кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.**

«Разумная і эфектыўная работа падатковай службы — не толькі ўстойлівае напаўненне бюджэтаў усіх узроўняў. Гэта ў першую чаргу магчымасць рэалізацыі прыярытэтных праектаў дзяржавы па важных кірунках, павелічэнне дабрабыту жыхароў Беларусі, выхаванне ў людзей пачуцця адказнасці за сучаснасць і будучыню сваёй краіны.

Дзякуючы ўкараненню лічбавых сэрвісаў і перадавога вопыту падатковае адміністраванне з году ў год становіцца больш эфектыўным, зразумелым і зручным як для фізічных асоб, так і для бізнесу.

Перакананы, высокі прафесіяналізм, кампетэнтнасць, прынцыповасць, добрасумленнасць будуць і надалей спрыяць паспяховаму выкананню няпростых задач, ускладзеных на ведамства», — сказана ў віншаванні.

Прэзідэнт Беларусі пажадаў супрацоўнікам ведамства згуртаванасці і поспехаў у дасягненні мэт. Моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту ў дамах і сем'ях.

# МЗС РАСТЛУМАЧЫЛА СІТУАЦЫЮ З «БРАЦКАЙ МАГІЛАЙ» У АШМЯНСКІМ РАЁНЕ

«У сувязі з нематываванай занепакоенасцю польскага боку сітуацыяй з месцам паблізу вёскі Мікулішкі Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці, якое ў польскіх СМІ чамусьці называецца «брацкай магілай польскіх салдат», часоваму паверанаму растлумачана, што, паводле інфармацыі мясцовых органаў улады, на тэрыторыі дадзенага населенага пункта воінскіх пахаванняў і пахаванняў замежных ваеннаслужачых не зарэгістравана. Беларускі бок вельмі ўважліва падыходзіць да такіх пытанняў. Таму ў дадзеным выпадку законнасць правядзення работ па ўладкаванні тэрыторыі дадаткова пацверджана Генеральнай пракуратурай і грунтуецца на атрыманні даных аб адсутнасці чалавечых астанкаў і іншых перашкаджаючых фактараў», — заявілі ў МЗС.

У ведамстве нагадалі, што адным з першых указаў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, які ўступіў на пасаду, стаў Указ ад 30 лістапада 1994 года нумар 231 «Аб паляпшэнні работы па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў у Рэспубліцы Беларусь». У сваю чаргу, пытанні захавання культуры пахавання вызначаны Законам ад 8 студзеня 2015 года нумар 237-З «Аб пахаванні і пахавальнай справе».

«Рэспубліка Беларусь асабліваставіцца да ўсіх пахаванняў, размешчаных на нашай зямлі. Гэта не толькі дзяржаўная палітыка, але і хрысціянскі, чалавечы падыход саміх беларусаў. Ніхто не можа папракнуць нас у апаганенні месцаў пахавання, зносах помнікаў або іх пашкоджанні, як гэта адбываецца ў шэрагу сумежных краін: у Польшчы толькі ў бягучым годзе зафіксавана каля 30 актаў вандалізму ў дачыненні да помнікаў людзям, якія аддалі свае жыцці за яе вызваленне ад фашызму, уключаючы трансляцыю ў прамым эфіры ў сакавіку гэтага года апаганення брацкай магілы 620 салдат у населеным пункце Хжовіцэ. У 1997 годзе на тэрыторыі Польшчы налічвалася 561 помнік, цяпер іх засталося менш за 100», — звярнулі ўвагу ў МЗС.

Крывёй беларусаў багата палітая не толькі зямля Беларусі, але і іншых дзяржаў, падкрэслілі ў ведамстве. «Таму, аберагаючы памяць ахвяр бясчынстваў, незалежна ад іх расы, веравызнання і ідэалагічных поглядаў, мы размяшчаем на ўзаемнасць», — адзначылі ў беларускім знешнепалітычным ведамстве.

«Заклікаем польскі бок да ўважлівага стаўлення да нашых законаў, у тым ліку ў такіх адчувальных пытаннях, як захаванне гістарычнай памяці. Яны павінны вырашацца не шляхам крыку і істэрыі, а паслядоўнай, прадуманай штодзённай работы. Калі да прадстаўнікоў польскага кіраўніцтва ўсё яшчэ не прыйшло разуменне бесперспектыўнасці любога ціску на Беларусь, то гатовыя яшчэ раз заклікаць польскі бок да стрыманасці і паважлівага падыходу да выбудоўвання дыялогу з беларускім бокам», — рэзюмавалі ў МЗС.

На кантролі

# Што перашкаджае дабудаваць дом?

## Камітэт дзяржкантролю Гродзенскай вобласці высветліў, чаму жылыя дамы не здаюцца ў тэрмін

**На сённяшні дзень у рэгіёне налічваецца 220 будынкаў звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва. Больш за палову з іх чакае сваёй чаргі пяць і больш гадоў. Значная частка даўгабудаў мае высокую ступень гатоўнасці.**

Трэба сказаць, што дынаміка па даўгабудах у вобласці ідзе на зніжэнне. Але праблема застаецца, бо кожны год з'яўляюцца новыя аб'екты, не здадзеныя ў тэрмін.

— Пакуль не ўдаецца выканаць даручэнне Прэзідэнта па скарачэнні аб'ектаў звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва. Летась папрацавалі годна, і гэта быў адзін з найлепшых вынікаў па краіне. Аднак ільвіная доля з таго, што ўдалося зрабіць летась і за першы квартал сёлета, датычыцца аб'ектаў, якія зусім нядаўна ўвайшлі ў лік даўгабудаў. Нязданзенымі засталіся тыя, што чакаюць сваёй чаргі пяць і больш гадоў, — падкрэсліў **старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці Анатоль ДАРОЖКА.**

Як паказаў аналіз сітуацыі, «хвароба» закладваецца на этапе распрацоўкі праекта. Несвоечасовае ўнясенне змяненняў цягне дадатковыя фінансавыя страты.

— Істотныя прэтэнзіі ёсць да распрацоўшчыкаў праектна-каштарыснай дакументацыі. Паводле даных Дзяржбудэкспертызы, па 147 аб'ектах былі выяўлены значныя парушэнні і недахопы. Пры гэтым часта парушаецца адзін з галоўных прынцыпаў — эканомнае расходаванне бюджэтных сродкаў. Такая сітуацыя назіраецца як на стадыі праектавання, так і выканання работ. Гэта сведчыць аб заніжаным кантролі і з боку заказчыкаў, у першую чаргу, упраўлення капітальнага будаўніцтва, і з боку саміх падрадчыкаў, — канстатаваў кіраўнік КДК Гродзенскай вобласці.

У ліку прычын з'яўлення даўгабудаў названы таксама нізкія тэмпы падрадных работ. Адзначалася, што па асобных аб'ектах няма дэталёвай прапрацоўкі крыніц фінансавання. Летась, напрыклад, увага аддавалася толькі тым дамам, якія нядаўна трапілі ў «чорны» спіс. Іх колькасць удалося знізіць амаль на 80 %. Між тым, большасць аб'ектаў засталіся замарожанымі, хоць ступень іх гатоўнасці дасягае 90 % і вышэй, а кансервацыя патрабуе дадатковых затрат.

Але і там, дзе аб'ект прыняты, будаўнікам прыходзіцца вяртацца, каб выправіць недаробкі. Такая карціна стала тыповай.

Праверкі КДК выявілі нямала фактаў завышэння кошту будаўніцтва. Яны правяраюцца праваахоўнымі органамі.

Разам з тым, тэмп будаўніцтва жылля ў вобласці расце. За чатыры месяцы бягучага года на тэрыторыі Гродзеншчыны ўведзена ў эксплуатацыю 180 тысяч квадратных метраў, што складае 117 % ад аб'ёму аналагічнага перыяду мінулага года. Урадам даведзены план — здаць да канца года 475 тысяч «квадратаў» жылой плошчы. Калі тэмпы работ застануцца на такім жа ўзроўні, заданне будзе перавыканана.

На такі ж вынік спадзяюцца прадстаўнікі будаўнічай галіны і па індывідуальнай забудове. Хоць пакуль тэмпы тут нізкія. Як паведамілі спецыялісты КДК, за чатыры месяцы насельніцтвам уведзена ў эксплуатацыю каля 290 дамоў агульнай плошчай 55 тысяч «квадратаў». Гэта значна менш, чым прадугледжваецца Дырэктывай № 8. У ёй сказана, што кожны год індывідуальнае жыллё павінна складаць не менш як 40 % ад усёй жылой забудовы. Але ёсць раёны, дзе за год будуюцца толькі два-тры дамы. Магчыма, гэта сведчыць аб непрывабнасці раёнаў, а таксама невялікім дастатку жыхароў.

Верагодна, менавіта фінансавая праблема спыняе засяленне 24 кватэр у блочных дамах у горадзе-спадарожніку Скідзелі. Кошт квадратнага метра ў іх складае 1300—1565 рублёў. І хоць у Гродзенскім раёне чарга на жыллё дасягае 1,5 тысячы чалавек, мала жадаючых набыць гэтыя дамы. У тым ліку і з боку жыхароў абласнога цэнтра, ад якога да Скідзеля ўсяго 30 кіламетраў па магістральнай трасе.

У адпаведнасці з новымі нарматыўнымі дакументамі, кошт квадратнага метра кожнага дома павінен быць не вышэй за сярэднюю заработную плату. Па вобласці гэта 1380 рублёў. Як адзначыў **старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Гродзенскага аблвыканкама Міхаіл ПЕТУХ,** ніводны індывідуальны дом у гэты кошт не ўкладваецца. Таму будаўніцтва ў раённых цэнтрах застаецца праблемным. З-за гэтага можа знікнуць такая спецыяльнасць, як муляр. Цяпер усяго 15-20 такіх спецыялістаў на вялікае будаўнічае прадпрыемства.

З-за падзення аб'ёмаў работ летась будаўнічая галіна панесла страту ў тры мільёны рублёў. Па словах Міхаіла Петуха, на сітуацыю значна паўплываў рост кошту будаўнічых матэрыялаў, якія падаражэлі ад 25 да 80 %. Толькі дзякуючы жыллёваму будаўніцтву ўдаецца загрузіць падрадныя будаўніча-мантажныя арганізацыі ў абласным цэнтры і раёнах.

Для вырашэння праблемы звышнарматыўнага будаўніцтва ў профільным камітэце аблвыканкама па 500 аб'ектах распрацаваны комплекс мерапрыемстваў, які прадугледжвае альбо іх завяршэнне, альбо перапрафіляванне, а таксама продаж ці знос. Большасць мерапрыемстваў ужо рэалізавана. Разам з тым, з пачатку года выяўлена больш за 100 новых звышнарматыўных будынкаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Экс-прэм'ера Японіі Сіндза Абэ застрэлілі падчас выступлення



Колішні прэм'ер-міністр Японіі Сіндза Абэ памёр у шпіталі пасля таго, як у яго двойчы стрэлілі падчас выступлення. Пра гэта паведаміла ТАСС. Узброены напад на былога кіраўніка ўрада быў учынены падчас яго выступлення ў японскім горадзе Нара. Зламыснік двойчы стрэліў у спіну Сіндза Абэ, пасля чаго экс-прэм'ер, які страціў прытомнасць, быў экстранна шпіталізаваны. Урачы рабілі ўсё магчымае для выратавання жыцця 67-гадовага палітыка, у тым ліку пераліванне крыві. Напад здзейсніў 41-гадовы жыхар Японіі Тэцуя Ямагамі, былы ваеннаслужачы, яго затрымалі. Падчас допытаў стала вядома, што стралок быў незадаволены палітыкай Сіндза Абэ і меў намер забіць яго. Кіруючая партыя Японіі прыпыніла перадвыбарную кампанію адразу пасля навін аб замаху на экс-прэм'ера, а таксама папрасіла ўсіх кандыдатаў адмовіцца ад любых вулічных выступленняў. Выбары ў верхнюю палату краіны запланаваны на 10 ліпеня. Сіндза Абэ ўзначальваў урад Японіі ў 2006—2007 гадах, а таксама ў 2012—2020 гадах. У 2020-м ён стаў рэкардсменам па працягласці бесперапыннага знаходжання на пасадзе прэм'ер-міністра за ўсю гісторыю краіны.

### Да 2,3 мільярда чалавек летась сутыкалася з недахватам харчавання



Пра гэта паведаміла Associated Press са спасылкай на даклад ААН. Паводле дакумента, «свет дэманструе рэгрэс у спробах скончыць з голадам, найскладанейшым становішчам у харчовай сферы і недаяданнем — ва ўсіх іх формах». «Самыя новыя даступныя даныя прымушаюць выказаць здагадку, што колькасць людзей у свеце, якія не могуць дазволіць сабе здаровую дыету, узрасла на 112 мільёнаў — да 3,1 млрд. Гэта стала вынікам росту спажывецкіх цэн на ежу падчас пандэміі COVID-19», — адзначаецца ў дакладзе. Паводле звестак, летась колькасць галадаючых узрасла ў Афрыцы, Азіі, Лацінскай Амерыцы і ў краінах Карыбскага мора. У ААН падкрэслілі, што ўзмацненне такіх з'яў, як пандэмія COVID-19, стыхійныя бедствы, узброеныя канфлікты ў спалучэнні з ростам няроўнасці патрабуюць ад урадаў хуткіх дзеянняў, каб падрыхтавацца да магчымых узрушэнняў у перспектыве. Аднак з улікам перагледжаных у бок сур'ёзнага зніжэння прагнозаў сусветнага эканамічнага росту чакаецца, што ў сельскагаспадарчы сектар цяпер паступіць толькі абмежаваны аб'ём інвестыцый.

### У Нью-Ёрку выставяць на аўкцыён шкілет дыназаўра ўзростам 76 мільёнаў гадоў



Акамянелы шкілет сваяка тыраназаўра будзе выстаўлены на аўкцыён Sotheby's у Нью-Ёрку ўжо ў бягучым месяцы. Пра гэта паведамляецца на афіцыйным сайце арганізацыі. Гаворка ідзе аб гаргазаўры, які жыў на захадзе ЗША і Канады ў канцы мелавога перыяду. Ён быў продкам тыраназаўраў, што з'явіліся праз 10 мільёнаў гадоў. Шкілет, які выставяць на продаж, быў знойдзены ў 2018 годзе каля ракі Джудзіт (прыток Місуры). Яго памеры складаюць амаль тры метры ў вышыню і сем метраў у даўжыню. Лот плануюць прадаць за 5-8 мільёнаў долараў. Гэта адзіны шкілет гаргазаўра, які будзе даступны для пакупкі. Астатнія акамянеласці знаходзяцца выключна ў музейных калекцыях.

Асоба

# СЫН МАЛОЙ РАДЗІМЫ

## 10 ліпеня спаўняецца 80 гадоў з дня нараджэння лётчыка-касманаўта, двойчы Героя Савецкага Саюза Пятра КЛІМУКА

**У вёсцы Камароўка, дзе нарадзіўся Пётр Клімук, і ў суседняй Тамашоўцы, дзе знаходзіцца музей касманаўтыкі, ганарацца сваім земляком. А тады, у далёкім 1973 годзе, калі ён адправіўся ў першы палёт з Валянцінам Лебедзевым, сусветныя агенцтвы ўраз зрабілі вядомай невялікую вёску ў Брэсцкім раёне. Да маці, Марфы Паўлаўны, пацягнуліся шматлікія наведвальнікі-карэспандэнты.**

Яна ўсіх прывячала, расказвала пра зорнага сына. Менш — пра цяжкасці, больш пра яго вучобу ў школе, прагу да ведаў, цікавасць, што з малых гадоў праяўляў да лётнай справы. Не адмаўлялася пагаварыць з журналістамі і сёстры касманаўта, яго земляк. Палёт беларуса ў космас стаў падзеяй для ўсёй рэспублікі, што ўжо казаць пра вёску, дзе ён нарадзіўся!

За першым палётам праз год з невялікім быў другі, а потым трэці. Пайшлі прысваенні высокіх званняў, заззялі на грудзях зоркі Героя, а ён пры першай магчымасці прыязджаў на радзіму, ніколі не адмаўляўся ад сустрэч у любым калектыве. Прыходзіў заўсёды з адкрытай душой, з нязменнай усмешкай, адказваў на любыя пытанні, прытым ніколі не адгароджваўся кардонам прэс-службаў, саветнікаў, памочнікаў. Пётр Ільіч, дарэчы, змог наладзіць нямала экскурсій для землякоў у Зорны Гарадок, многія там пабывалі, калі ён кіраваў Цэнтрам падрыхтоўкі касманаўтаў імя Гагарына.



Пётр КЛІМУК з аднакласніцамі на малой радзіме.

...Згадваю сустрэчу ў абласной газеце «Зара» ў 2002 годзе. Яна адбылася амаль выпадкова. Тагачасны дырэктар ААТ «Астрамечава» Аляксей Скакун, чым госцем у той дзень быў Пётр Клімук, арганізаваў яе нам за нейкую гадзіну. Сабраліся ўсе, хто быў у рэдакцыі. І як жа хораша, душэўна мы тады пагутарылі!

Пётр Ільіч загаварыў пра тое, што з гадамі найбольш блізкімі і зразумелымі для яго сталі разважанні Васіля Шукшына пра родныя мясціны. «У прозе апошніх гадоў свайго кароткага жыцця пісьменнік не раз звяртаўся да новага пачуцця, якое ахоплівала яго на радзіме. Гэта пачуццё велізарнага неадплатнага доўгу перад роднай вёскай. Яно авалодвала ўсёй асобай лірычнага героя. Нешта падобнае адбываецца і са мной», — разважаў касманаўт. І было зразумела, што апошняе абумоўлена характарам Пятра Клімука, багата надзеленага сціпласцю, дабрынёй, душэўнай шчодрасцю. Тут мы дакладна маем справу з выпадкам, калі земляні ніякім чынам не могуць папракнуць праслаўленага лётчыка-касманаўта ў тым, што ён заганарыўся альбо забыўся на родныя мясціны. І тады, пасля нашай сустрэчы, ён накіроўваўся ў сваю Камароўку — збіраўся наведаць школу. Усе гады ён, як мог, дапамагаў роднай школе, ды і проста землякам. Дзякуючы найперш яго клопатам там ёсць багаты музей касманаўтыкі. Ды і аграгарадок Тамашоўка — адзін з найпрыгажэйшых на Брэстчыне, стаў такім не без удзелу знакамітых выхадцаў.

У музеі з задавальненнем раскажуць біяграфію касманаўта. Нарадзіўся ён у 1942 годзе, калі бацька Ілья Фёдаравіч быў у партызанскім атрадзе. А ў 1944-м, пасля вызвалення, бацьку прызвалі ў армію. Загінуў пры вызваленні Польшчы. Маці засталася з трыма дзецьмі на руках. У школе Пеця вучыўся добра. Некаторы час сядзеў за адной партай з Пятром Пракаповічам, які ў канцы 1990-х узначаліў Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь.

Сярэднюю школу Клімук скончыў у 1959 годзе. Паступіў у лётную школу ў горадзе Крамянчуг, потым стаў курсантам Чарнігаўскага вышэйшага ваеннага вучылішча. У 1964 годзе скончыў вучылішча з адзнакай. Служыў у авіяцыйных часцях Савецкай Арміі. Ужо ў 1965-м быў залічаны ў атрад касманаўтаў. Прайшоў поўны курс агульнакасмічнай падрыхтоўкі і падрыхтоўкі палётаў на караблях тыпу «Саюз».

У свой першы палёт Пётр Клімук адправіўся з Валянцінам Лебедзевым 18 снежня 1973 года ў якасці камандзіра карабля «Саюз-13». Працягласць палёту склала 7 дзён 20 гадзін 55 хвілін.

Затым прайшоў падрыхтоўку і комплекс трэніровак да працяглых палётаў. Другі палёт здзейсніў з Віталем Севасцьянавым з 24 мая да 26 чэрвеня 1975 года. Ужо двойчы Героя Савецкага Саюза, адправілі ў трэці палёт з польскім касманаўтам Міраславам Гермашэўскім ў 1978 годзе.

Пазней, разам з Міраславам, яны адшукаюць магілу Ільі Клімука ў Польшчы. Будуць сябраваць сем'ямі, адпачываць разам у Белавежскай пушчы і ў адным з польскіх дамоў адпачынку.

Паміж палётамі і падрыхтоўкамі Пётр Клімук нястомна вучыўся. Ён паспяхова скончыў Ваеннапаветраную акадэмію імя Гагарына, Ваенна-палітычную акадэмію імя Леніна, абараніў спачатку кандыдацкую, затым доктарскую дысертацыі ў галіне тэхнічных навук. У 1998 годзе яму прысвоена званне генерал-палкоўніка авіяцыі. На працягу 13 гадоў, да 2003 года, наш зямляк узначальваў Цэнтр падрыхтоўкі касманаўтаў. Ён ганаровы грамадзянін Брэста і Брэсцкай вобласці. Свой юбілей Пётр Ільіч будзе сустракаць у Зорным Гарадку, але да канца лета абяцаў наведаць родныя мясціны.

Тады, дарэчы, на сустрэчы 20 гадоў таму я спытала ў касманаўта пра гісторыю стварэння песні «Мне приснился шум дождя». Пётр Ільіч расказаў, што яе вытокі менавіта ў іх з Севасцьянавым палёце. Тады, на арбіце, Віталю прысніўся дождж, яны падзяліліся гэтым на адной з сустрэч з творчымі людзьмі. Паэт Уладзімір Лазараў напісаў словы, а кампазітар Яўген Дога — музыку. Так нарадзілася цудоўная лірычная песня, якую палюбілі ўсе касманаўты. А ў космасе яму таксама сніліся родная краявіды, памытыя дажджамі і асвечаныя сонцам.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**

Сацыяльная інтэграцыя

# РОЗНЫЯ — РОЎНЫЯ

## Кампенсацыя затрат на сродкі рэабілітацыі, інклюзія ў адукацыі, квоты пры працаўладкаванні... Што мяняецца з прыняццем новага закона аб правах інвалідаў

**У Беларусі прыняты Закон «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі». Яго нормы закрануць каля паўмільёна чалавек — 6 % беларусаў маюць інваліднасць. Навацыі прадугледжваюць, у прыватнасці, кампенсацыю затрат на набыццё сродкаў рэабілітацыі, права на паслугу персанальнага асістэнта, інклюзію ў адукацыі і падрыхтоўку педагагічных работнікаў, якія валодаюць жэставай мовай, чытаннем і пісьмом па сістэме Брайля, даступнае асяроддзе ўсіх навучальных устаноў, устанаўленне квот для наймальнікаў па прыёме на работу людзей з інваліднасцю.**

Як адзначыла **начальнік упраўлення па справах інвалідаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Вікторыя ГРАЧЫХА,** у падрыхтоўцы закона былі задзейнічаны шматлікія грамадскія арганізацыі. Трэць ад агульнай колькасці рабочай групы была прадстаўнікамі такіх аб'яднанняў, як Беларускае таварыства інвалідаў, Беларускае таварыства глухіх, Беларускае таварыства інвалідаў па зроку, Беларускі Чырвоны Крыж, Паралімпійскі камітэт і іншыя.

— У законе замацаваны ключавыя правы інвалідаў: на самастойны лад жыцця, рэабілітацыю, абілітацыю, адукацыю і працаўладкаванне. Уведзена забарона на дыскрымінацыю па прыкмеце інваліднасці. Гэта дапаможа мінімізаваць злоўжыванні ў адносінах да людзей з інваліднасцю, — адзначыла Вікторыя Грачыха.

Эксперт звярнула ўвагу, што асаблівы акцэнт у законе зроблены на асветна-выхаваўчую работу, якая мусіць сфарміраваць у грамадстве дастойныя адносіны да людзей з інваліднасцю і знішчыць стэрэатыпы, якія маюцца.

У рэабілітацыі і абілітацыі інвалідаў асноўны акцэнт зроблены на сацыяльны складнік. Ён асучаснены і дапоўнены з улікам практык людзей з інваліднасцю. У прыватнасці, ім прадугледжваецца кампенсацыя з боку дзяржавы затрат на набыццё сродкаў рэабілітацыі. Раней гэта таксама



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

практыкавалася, аднак цяпер норма замацавана ў законе.

— У пастанову Савета Міністраў № 1722, якая вызначае парадак кампенсацыі, будуць унесены змяненні. Для кампенсацыі варта звяртацца ў мясцовыя органы ўлады. Прынцып такі ж, як і кампенсацыя пры набыцці памперсаў, — растлумачыла Вікторыя Грачыха.

Паслуга персанальнага асістэнта будзе аказвацца ў залежнасці ад індывідуальных патрэб: камусьці — для наведвання паліклінікі, некаму — для атрымання юрыдычнай кансультацыі і іншага.

Што датычыцца ўстанаўлення квот для наймальнікаў па прыёме на работу людзей з інваліднасцю, дадзеная норма запрацуе з 1 студзеня 2025 года, калі будзе прыняты закон аб занятасці насельніцтва.

Прадугледжвае новы закон і стварэнне публічнай кадастравай карты са звесткамі аб даступнасці аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры для людзей з інваліднасцю — своеасаблівага віртуальнага гіда па горадзе.

Дзяржава гарантуе і падрыхтоўку педагагічных работнікаў, якія валодаюць спецыяльнымі формамі, метадамі навучання і выхавання пры рабоце з інвалідамі.

— Замацаваны абавязацельствы дзяржавы па забеспячэнні падрыхтоўкі педагагічных работнікаў, якія валодаюць спецыяльнымі метадамі навучання і выхавання, у тым ліку мовай жэстаў, тэхнікай чытання і пісьма па сістэме Брайля, асноўнымі тэхналогіямі аўдыядэскрыпцыі, — сказала Вікторыя Грачыха.

Як паведаміла **галоўны спецыяліст упраўлення дашкольнай адукацыі галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Алена МУЛІЦА**, сёння такая падрыхтоўка вядзецца ў асноўным у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка. Аднак на ўсіх педагагічных спецыяльнасцях уведзены курсы, якія знаёмяць будучых педагогаў з асаблівасцямі розных катэгорый дзяцей.

Законам замацоўваецца паняцце прынцыпу інклюзіі ў адукацыі.

— Норма, якая сапраўды заканадаўча замацоўвае дасягненні нашай краіны ў забеспячэнні роўнага доступу да адукацыі для ўсіх дзяцей, незалежна ад таго, ці ёсць у іх інваліднасць, ці ёсць у іх нейкія парушэнні, — гэта ўвядзенне ў заканадаўства прынцыпу інклюзіі ў адукацыі, які забяспечвае роўны доступ да атрымання адукацыі для ўсіх навучэнцаў, з арыентацыяй на індывідуальныя адукацыйныя патрэбнасці кожнага. Адпаведна, і ў Законе «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі» гэтая норма ўведзена ў адносінах да дзяцей з інваліднасцю, — адзначыла Алена Муліца.

Асноўныя палажэнні закона ўступяць у сілу з 6 студзеня 2023 года.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ЦЯПЛО АД ТОРФУ, ШЧЭПАК І... ТРУБЫ

## Кіламетр цеплasеткі

Замена цепласетак — адна з задач дзяржпраграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе», — якая да таго ж штогод праводзіцца ў межах падрыхтоўкі да асенне-зімовага перыяду. Аднак у шэрагу абласцей апошнія гады назіраецца негатыўная практыка па невыкананні заданняў па замене цепласетак, заўважыла **Святлана ЦІМОШКІНА, намеснік начальніка ўпраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі ЖКГ:**

— З 2016 года ў Гомельскай вобласці заданні не выкананы двойчы, у Гродзенскай — тройчы, а ў Мінскай — чатыры разы. Пры гэтым тэмпы па замене цепласетак у цэлым па краіне захоўваюцца (каля 3 % на год). Гэта дазволіць ліквідаваць увесь назапашаны за папярэднія гады недарамонт трубаправодаў са звышнарматыўным тэрмінам службы ўжо праз пяцьсем гадоў. Праўда, у абласных гарадах гэты тэрмін можа быць больш працяглы.

**Сёлета арганізацыям неабходна замяніць 479,4 кіламетра цепласетак, на што прадугледжана 144,9 млн рублёў, амаль 120 млн з іх — за сродкі мясцовых бюджэтаў і 41,8 млн — з уласных сродкаў арганізацый.**

Замена аднаго кіламетра трубаправода ў сярэднім абыходзіцца ў 188,9 тысячы рублёў, аднак неабходны аб'ём фінансавання непасрэдна залежыць ад дыяметра трубаправода (работы па замене кіламетра трубы дыяметрам да 200 мм каштуюць прыкладна 302 тысячы, дыяметрам ад 200 да 400 мм — 837 тысяч, ад 400 да 600 мм — 1 млн 900 тысяч).

## Мяняць адпаведна аварыйнасці

Пра меры, што прымаюцца для выканання задання па замене цепласетак, а таксама палітыку энергазберажэння ў раёне расказалі мясцовыя камунальнікі. Працягласць цепласетак, якія абслугоўваюцца на Стаўбцоўшчыне, 100 кіламетраў, з іх палова — сучасныя перадізаляваныя канструкцыі (ПІ-трубы). 44 кіламетры — сеткі з нарматыўным тэрмінам эксплуатацыі. Сёлета па плане на Стаўбцоўшчыне трэба замяніць чатыры кіламетры сетак (пяць участкаў), на што спатрэбіцца 1,1 млн рублёў, з якіх ёсць 550 тысяч.

Летам маркуюць завяршыць замену цепласеткі на адным з

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



участкаў у Стоўбцах, якая эксплуатавалася 31 год. За гэты час на ёй было восем пашкоджанняў, апошняе — летась. Таму ў межах комплекснага падыходу да добраўпарадкавання вырашылі замяніць гэты ўчастак з наступным добраўпарадкаваннем.

Падчас падрыхтоўкі да асенне-зімовага перыяду, калі пры правядзенні гідраўлічных іспытаў на цепласетках знаходзілі два і больш пашкоджанняў, іх рэкамендавалі да замены, адзначаюць мясцовыя камунальнікі.

— Пашкоджанні фіксуюцца не для таго, каб пасварыцца, а каб вызначыць крытэрыі, якія будуць патрабаваць замены цепласетак. Таму не трэба іх хаваць, — растлумачыў **Генадзь ТРУБІЛА, першы намеснік міністра ЖКГ.**

— Аднак ёсць інфармацыя, што ўлік пашкоджанняў на аб'ектах камунальнай цеплаэнергетыкі Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей не вядзецца належным чынам, — дадала Святлана Цімошкіна.

**Міністр ЖКГ Андрэй ХМЕЛЬ**, у сваю чаргу, заклікаў не прыхоўваць статыстыку пашкоджанняў, а інфармаваць пра іх, каб ведаць сапраўдную існуючую сітуацыю. Бо для насельніцтва цеплазабеспячэнне — самая важкая камунальная паслуга, хоць пакуль яно і плаціць за цяпло толькі 20 % ад кошту, а астатняе — пакрываюць субсідыі. Пры гэтым Міністэрства ЖКГ праводзіць палітыку змяншэння затрат на абаграванне, аднак не толькі для памяншэння субсідый, але і для росту зарплаты работнікаў галіны, нагадаў міністр і прапанаваў выпрацаваць методыку прыцягнення адказнасці за такія прыхоўванні і правяраць, які насамрэч стан камунікацый.

Мяняць цепласеткі, зыходзячы з іх аварыйнасці, праводзіць гідраўлічныя іспыты і такім чынам планаваць выкананне работ — з такой прапановай звярнуўся да міністра **Юрый КУКАШУК, генеральны дырэктар жыллёва-камунальнай гаспадаркі Мінскай вобласці.**

## Амартызацыйныя адлічэнні і цэнтралізаваныя закупкі

Другая прапанова камунальнікаў Міншчыны — адкрыццё спецыяльных рахункаў, на якіх будуць акумулявацца сродкі, каб у далейшым накіроўваць іх толькі на мадэрнізацыю цепласетак, дадаў Юрый Кукашук:

— А яшчэ добра было б стварыць асобнае прадпрыемства (структурнае падраздзяленне), якое б займалася ўсімі пытаннямі цеплазабеспячэння, што палепшыць работу ў межах замены цепласетак.

Стварэнне асобнай структуры для работы па цеплазабеспячэнні, аднак, стане вельмі негатыўным фактарам для комплексных арганізацый ЖКГ, таму што гэта, бадай, адзіная крыніца іх даходу. У іх застанецца толькі тэхабслугоўванне і праблемы добраўпарадкавання, так што, напэўна, не вельмі мэтазгодна ствараць асобнае падраздзяленне, пракаментаваў міністр:

— А каб сродкі на замену цепласетак не адцягваліся на добраўпарадкаванне, трэба больш жорстка сачыць за іх выкарыстаннем. Што ж датычыцца адлічэнняў сродкаў ад амартызацыі ў нейкі фонд, то можна паспрабаваць гэта, але асцярожна. Таму што ў краіне ёсць арганізацыі, якія заўжды займаліся заменай цепласетак, сёння маюць 100 % камунікацый у ПІ-трубах — і будуць абавязаны адлічваць сродкі за амартызацыю ў нейкі фонд. Аднак можа здарыцца, што пасля ім гэтыя грошы не дастануцца і, па сутнасці, яны такім чынам будуць субсідзіраваць сваімі сродкамі тую арганізацыю, якая за час сваёй работы дрэнна выконвала абавязацельствы па замене цепласетак. Магчыма, лепш вярнуцца да практыкі, калі адбывалася цэнтралізаваная закупка ПІ-трубы. Калі б у камунальнікаў быў буйны заказ, у тым ліку рэспубліканскі, то можна было б сэканоміць 15-20 % толькі на набыцці матэрыялаў. Але ці зможа адзін пастаўшчык закрыць усе патрэбы — пытанне.

На Гродзеншчыне таксама разглядалі пытанне стварэння цэнтралізаванага пазабюджэтнага фонду, каб акумуляваць у ім сродкі ад амартызацыі, аднак сутыкнуліся з дзвюма праблемамі, расказала **Наталля ГУЛАМАВА, начальнік упраўлення ЖКГ Гродзенскага аблвыканкама:**

— Першае, што частка раёнаў такім чынам сапраўды будзе працаваць на іншыя. А другое, паколькі адлічэнні ідуць з прыбытку, атрымліваецца, што прадпрыемствы, якія добра працуюць, будуць яшчэ і пакараныя выкарыстаннем прыбытку. Хоць яны маюць амартызацыю, якую яшчэ не выкарысталі, аднак яна ўжо ў выніку легла на затраты. Таму ад гэтага шляху адмовіліся.

Спецыяліст падзялілася вопытам замены цепласетак у Гродзенскай вобласці.

— Усе бюджэтныя сродкі мы выдаём толькі на набыццё ПІ-трубы. Будаўніча-мантажныя работы ў раёнах выконваюцца ў асноўным гаспадарчым спосабам, а праектна-каштарысная дакументацыя — за ўласныя сродкі. Аднак жорсткага кантролю з боку вобласці за амартызацыйнымі адлічэннямі не вядзецца.

У Гродне, дарэчы, распрацавана схема цеплазабеспячэння да 2035 года, адной з умоў якой з'яўляецца рэканструкцыя цепласетак, а таксама ліквідацыя цэнтральных цеплавых пунктаў і ўладкаванне індывідуальных цеплавых пунктаў. Аднак гэта дарагі праект, і сёлета сродкаў на замену 12,7 кіламетра цепласетак не знойдуць, заўважыла яна:

— Мы хацелі б прапанаваць, каб пры разліку дадзенага паказчыка ўлічваўся аб'ём ліквідаваных сетак, калі чатырохтрубная сістэма мяняецца на двухтрубную.

У сталіцы назіраецца праблема з транзітнымі сеткамі, іх замена заўсёды праходзіць доўга, складана і цяжка. Транзітныя трубаправоды з тэрмінам эксплуатацыі больш за 25 гадоў займаюць амаль 70 %. Сёння 98 кіламетраў сетак не праблемныя, падзялілася **Наталля РОШЧЫНА, дырэктар Мінсккамунцепласеткі:**

— Вонкавых трубаправодаў са звышнарматыўным тэрмінам эксплуатацыі ў арганізацыі сёння 123 кіламетры, чацвёртая частка з якіх не падлягае замене і рэканструкцыі, паколькі падпадае пад забудову, і там зроблена замена па капрамонце. Пашкоджанасць пры гэтым там невялікая. Але не ўсе цепласеткі са звышнарматыўным тэрмінам выкарыстання трэба мяняць, бо, зыходзячы з іх стану, яны праслужаць яшчэ доўга, а ёсць іншыя, значна маладзейшыя, якія, згодна з заканадаўствам, не падлягаюць замене, аднак іх стан дрэнны.

Для выпраўлення сітуацыі ў арганізацыі прапануюць матрыцу крытэрыяў па стратах і пашкоджанасці, якую можна выкарыстоўваць для ацэнкі стану цепласетак і іх перспектыў.

## Лабараторыя якасці торфу

У межах праграмы энергазберажэння ў Мінскай вобласці за 2016—2021 гг. збудавана шэсць цеплакрыніц, дзе ў якасці паліва выкарыстоўваецца ў тым ліку торф. Іх агульная магутнасць 57,5 МВт: дзве — у Смалявіцкім раёне, адна — у Нясвіжскім, Слуцку, Стоўбцах, Крупках, з якіх 38 МВт атрымліваюць ад фрэзернага торфу.

Да 2018 года Стоўбцы забяспечвалі цяплом пераважна з дапамогай газу з кацельнай Мінскага маторнага завода. Сабекошт 139 рублёў за 1 Гкал, адпускалі 49 тысяч на год, з якіх 33 тысячы прыходзілася на жылфонд. Недахопам такой схемы цеплазабеспячэння быў участак цепласеткі працягласцю 1,3 кіламетра з трубамі вялікага дыяметра — 600 мм. У межах праграмы энергазберажэння разглядалася пытанне павелічэння долі мясцовых відаў паліва для зніжэння сабекошту. Як вынік, вырашана было будаваць кацельную на фрэзерным торфе.

— Магутнасць сучаснай кацельнай у Стоўбцах 24 МВт, з якіх 12 МВт выпрацоўваецца на фрэзерным торфе, а 12 — на прыродным газе. Цяпер колькасць цяпла, што ствараецца, павялічылася да 52 тысяч Гкал, бо дадалося некалькі новых дамоў да сістэмы. Пры гэтым сабекошт цеплаэнергіі зменшыўся да 95,9 рубля, а доля выкарыстання МВП падрасла да 75 %. На 4,1 % знізіліся і цеплавыя страты шляхам вываду са строю ўчастка 1,3 кіламетра з вялікім дыяметрам трубы. У выніку на 6,7 м³ на год зменшылася выкарыстанне газу, — расказаў **намеснік гендырэктара па камунальнай гаспадарцы ЖКГ Мінскай вобласці Андрэй ШУЛЬГА.**

Сёлета ў Крупскім раёне і Клецку збудуюць яшчэ дзве кацельныя з выкарыстаннем торфу, на што мяркуюць прыцягнуць сродкі Мінэнерга. А яшчэ ў планах мясцовых камунальнікаў — зрабіць лабараторыю, якая кантралявала б якасць тарфянога паліва, тым больш што кошт гэтага паліва, якое на кацельную пастаўляюць прадпрыемствы Белпалівагаза, падаецца дарагім. Вышэйшым з сітуацыі бачыцца ўласная нарыхтоўка камунальнікамі прыроднага паліва, у прыватнасці, шчэпак.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Будзь у курсе!

# МАГІСТРЫ ПА РАДЫЯЦЫЙНАЙ БЯСПЕЦЫ

**Новая спецыяльнасць «Ядзерная і радыяцыйная бяспека» з прафілізацыяй «Радыяцыйная абарона і культура ядзернай бяспекі» адкрываецца ў магістратуры хімічнага факультэта БДУ. Падрыхтоўка па дадзеным напрамку будзе ажыццяўляцца ў Беларусі ўпершыню.**

Адкрыццё новай праграмы абумоўлена ўзрослай запатрабаванасцю спецыялістаў для работы на дзеючай атамнай электрастанцыі і ў профільных арганізацыях. У першую чаргу былі ўлічаны запыты і пажаданні арганізацый — заказчыкаў кадраў — БелАЭС, дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС Беларусі, навуковых інстытутаў Нацыянальнай акадэміі навук, Міністэрства энергетыкі і іншых. У будучым плануецца ўзмацніць удзел заказчыкаў у падрыхтоўцы магістрантаў.

Адметнасцю згаданай праграмы з'яўляецца яе сеткавы характар. Адукацыйны працэс будуць забяспечваць шэсць беларускіх ВНУ-партнёраў: БДУ, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы, Палескі дзяржаўны ўніверсітэт і Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт.

Слухачоў чакаюць заняткі ў рамках 11 модуляў, сярод якіх прыкладная ядзерная хімія, радыяцыя і біялагічныя сістэмы, тэхніка радыяцыйнага кантролю, ядзерная небяспека і ацэнка рызык, прыкладная ядзерная фізіка і іншыя.

Для выпускнікоў профільных спецыяльнасцяў прадугледжаны адзін экзамен — «Фізіка-хімічныя асновы экалогіі». Спецыялісты гуманітарнага напрамку, акрамя асноўнага іспыту здаюць дадатковы экзамен.

Заняткі пачнуцца ў верасні 2022 года. Тэрмін навучання складае 1 год 8 месяцаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ГВАЛТ, ДЫСКРЫМІНАЦЫЯ І САКРЭТНЫЯ ТУРМЫ

## Як на Захадзе парушаюць правы чалавека

**Міністэрства замежных спраў Беларусі апублікавала на афіцыйным сайце чарговы даклад «Найбольш рэзанансныя выпадкі парушэння правоў чалавека ў асобных краінах свету — 2022». Такім чынам МЗС развянчае міф аб бязгрэшнасці заходніх дзяржаў у пытаннях захавання правоў чалавека. «Укаранёны шаблон успрымання заходніх дэмакратый — паспяховы плён інфармацыйнай работы палітычных тэхналогій», — падкрэслілі ў МЗС. У доказ гэтага сцвярджэння ў дакладзе прыводзяцца факты і фатаграфіі з адкрытых крыніц, у тым ліку СМІ, а таксама дакументы міжнародных устаноў, якія галоўным чынам ахопліваюць дзеянні заходніх дзяржаў як у дачыненні да масавых акцый, так і ў дачыненні да грамадзян, чыя пазіцыя адрозніваецца ад падыходаў уладаў. Як на Захадзе парушаюць правы чалавека?**

### КОНТУРЫ КРЫЗІСУ

У заходніх дзяржавах глыбока ўкараніўся ўнутраны крызіс — іх палітычная эліта цалкам адарвана ад рэальных патрэбнасцяў свайго грамадства. Аб гэтым заявіў міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей ва ўступным слове да даклада МЗС. «Дамінантная змястоўная лінія, што пранізвае ўвесь даклад, дэманструе наяўнасць праблемы ў сферы захавання правоў чалавека, якая востра стаіць у заходнім грамадстве. Такая праблема асабліва ўзмацнілася на фоне грамадскіх супярэчнасцяў, выкліканых нездаволенасцю насельніцтва палітыкай пандэмійных абмежаванняў, якая ўсё яшчэ прадаўжаецца, і рэзкім спадам узроўню жыцця», — адзначыў міністр.

Паказальна, паводле яго слоў, што гаворка ідзе аб краінах, якія больш за ўсё спрабуюць навязваць свету сваю мадэль дэмакратыі і праваахоўных практык. «Даклад дае магчымасць акрэсліць контуры ўнутранага крызісу, які глыбока ўкараніўся ў заходніх дзяржавах, а менавіта поўнай адарванасці палітычнай эліты ад рэальных патрэбнасцяў свайго грамадства. У пагоні за ўсёмагутнасцю на знешнім флангу, у спробах навучыць жыццю іншыя дзяржавы палітычнаму істэблішменту гэтых краін стала не да сваіх грамадзян. Толькі некаторымі прыкладамі такой «палітыкі адмены» ў адносінах да простых людзей з'яўляецца сістэмная дыскрымінацыя ў грамадстве, практычна штодзённыя сілавыя разгоны мірных пратэстаў, парушэнні правоў бежанцаў і мігрантаў, блакіроўка доступу да СМІ і іншае. Усё гэта яскрава праілюстравана ў дакладзе на прыкладзе канкрэтных кейсаў», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

### РАЗ'ЯДНАНЫЯ ШТАТЫ

Шэраг гучных здарэнняў адбыўся ў Злучаных Штатах. Адной з важных праблем у сферы абароны правоў чалавека ў ЗША доўгі час з'яўляецца няздольнасць амерыканскіх уладаў забяспечыць абарону насельніцтва ад гвалту з боку паліцыі, адзначаецца ў дакладзе МЗС Беларусі. Звыш 1,1 тысячы чалавек загінула летась у Штатах у выніку гвалту сілавікоў. Большасць забойстваў адбылося падчас негвалтоўных правапарушэнняў — або калі злачынства наогул не было. З 2015 года паліцыя ЗША смяротна параніла больш як 6,3 тысячы чалавек, але толькі 91 паліцэйскі быў арыштаваны, што складае ўсяго 1 працэнт ад агульнай колькасці злачынцаў. Паводле інфармацыі амерыканскіх СМІ, летась адбыліся 693 масавыя расстрэлы, што на 10 працэнтаў больш, чым у 2020-м. Больш як 44 тысяч чалавек было забіта ў выніку гвалту з прымяненнем агнястрэльнай зброі.

Улады ЗША не выконваюць прынцыпы справядлівага судовага разбору і працэдур. У апошнім дакладзе спецыяльны дакладчык па пытанні аб заахвочванні і абароне правоў чалавека і асноўных свабод ва ўмовах барацьбы з тэрарызмам Фінула Ні Илан інфармавала, што ў цэнтры ўтрымання у Гуантанама застаюцца пад вартай 38 мужчын-мусульман. Многіх з гэтых людзей Злучаныя Штаты ўтрымліваюць пад вартай ужо дваццаты год. Многія з іх перажылі здзекі. Дванаццаць з іх былі абвінавачаны ў злачынствах, звязаных з тэрарызмам, і праходзяць праз сістэму ваенных камісій, а не грамадзянскіх судоў. Паводле слоў спецдакладчыка, цяперашнія ўмовы ў Гуантанама параўнальныя з катаваннем.

Акрамя таго, улады ЗША не змаглі забяспечыць сваім грамадзянам эфектыўную абарону ў сферы аховы здароўя. Нягледзячы на наяўнасць перадавога медыцынскага абсталявання і тэхналогій, у ЗША была зарэгістравана найбольшая ў свеце колькасць выпадкаў заражэння і смерці ад COVID-19. Паводле апошніх даных Універсітэта Джона Хопкінса, колькасць пацверджаных выпадкаў ковіду ў ЗША перасягнула 88 мільёнаў, а колькасць памерлых ад яго — мільён чалавек.

Разрыў паміж багатымі і беднымі пагаршае сацыяльную несправядлівасць, а праблемы з правамі чалавека, з якімі сутыкаюцца ніжнія пласты насельніцтва, становяцца ўсё больш сур'ёзнымі, адзначыла «Жэньмінь жыбаа». Нядзіўна, што колькасць выпадкаў заражэння каранавірусам сярод бедных амерыканцаў большая, а смяротнасць вышэйшая. Пасля ўспышкі эпідэміі шматлікія амерыканцы трапілі ў харчовы крызіс, працяглась жыцця бедных людзей працягвае скарачацца.

Летась каэфіцыент Джыні (які характарызуе разрыў) дасягнуў 0,48 — найвышэйшы паказчык за апошнія паўстагоддзя. Паводле ацэнак інстытута Oxford Economics, з сакавіка 2020-га да студзеня 2021-га, капітал 20 працэнтаў багатага амерыканскага насельніцтва павялічыўся прыкладна на 2 трыльёны долараў, а найбяднейшых 20 працэнтаў насельніцтва страцілі больш за 180 млрд долараў. Вядомы інвестар Стэнлі Дракенмілер заявіў, што безразважнае друкаванне грошай Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША з'яўляецца галоўнай прычынай палярызацыі грамадства.

Хранічную праблему разрыву паміж багатымі і беднымі складана выкараніць, яе прычынай з'яўляецца безгрунтоўнасць палітычнай і эканамічнай сістэмы, а таксама бязладнае кіраванне ў ЗША. Дэмакратыя па-амерыканску, якую палітыкі актыўна распаўсюджваюць, ужо даўно стала выключна гульнёй багатых людзей. Прафесар Калумбійскага ўніверсітэта Джэфры Сакс адзначыў, што за 40 гадоў амерыканская палітыка ўжо стала гульней людзей з пэўных колаў, у ахвяру прыносяцца інтарэсы большасці грамадзян для аказання дапамогі звышбагатым і карпаратыўным лобі. Цяпер адчужэнне амерыканскай дэмакратыі стала сур'ёзнай перашкодай для рэалізацыі правоў чалавека найбяднейшымі пластамі грамадства.



Наяўнасць сістэмнага крызісу ў ЗША прызнаюць ва ўсім свеце. Знакамітая статуя Свабоды ў Нью-Ёрку страціць сваю сімвалічнасць, калі журналісту Джуліяну Асанжу прысудзяць максімальны тэрмін. Пра гэта заявіў прэзідэнт Мексікі Андрэс Мануэль Лопес Абрадор, паведамляе РІА «Навіны». Абрадор заявіў, што гатовы пачаць кампанію па знoсе статуі Свабоды, калі заснавальніка WikiLeaks Джуліяна Асанжа экстрадуюць у ЗША і там прыгавораць да максімальнага тэрміну і смерці ў турме. Падобныя дзеянні будуць азначаць, што статуя больш не з'яўляецца сімвалам свабоды.

### ЧОРНЫЯ ДЗІРКІ

У сваім дакладзе 2022 года спецыяльны дакладчык па пытанні аб заахвочванні і абароне правоў чалавека і асноўных свабод ва ўмовах барацьбы з тэрарызмам Фінула Ні Илан нагадала, што Еўрапейскі суд па правах чалавека прызнаў Літву нараўне з шэрагам іншых дзяржаў саўдзельніцай катаванняў і насільных знікненняў зняволеных у рамках праграм ЗША па выдачы і тайным утрыманні пад вартай. Спецдакладчык заклікала забяспечыць правядзенне або ў адпаведных выпадках аднаўленне ўрадамі, у тым ліку Літвы, эфектыўнага незалежнага судовага або квазісудовага расследавання дакладных сцвярджэнняў аб тым, што на іх тэрыторыі былі створаны сакрэтныя турмы («чорныя дзіркі»).

Літоўскія ўлады ўхіляюцца ад расследавання свайго дачынення да катаванняў у сакрэтных турмах Цэнтральнага разведвальнага ўпраўлення ЗША, зрэшты, як і прадаўжаюць адмаўляць наяўнасць такіх турмаў у краіне. Разам з тым летась у снежні Міністэрства юстыцыі Літвы выплаціла кампенсацыю палесцінцу Абу Зубайду за незаконнае ўтрыманне ў сакрэтнай турме ЦРУ пад Вільнюсам. Той факт, што Еўрапейскі суд па правах чалавека абавязаў Літву выплаціць гэтую кампенсацыю, сведчыць аб ілжывасці адмаўлення ўлады мі наяўнасці такіх турмаў.

Жорсткае абыходжанне санкцыянавана на дзяржаўным узроўні не толькі ў адносінах да зняволеных, але і ў адносінах да мігрантаў. Прычым гэта датычыцца не толькі Вільнюса, а і шэрага іншых краін. У прыватнасці, «праславілася» вельмі жорсткімі адносінамі да бежанцаў і Варшава. Шматлікія выпадкі выдварэння мігрантаў, ігнараванне працэдур прадастаўлення ім прыстанішча і гарантый правоў чалавека з боку Польшчы пацвярджае нават арганізацыя Amnesty International. У гэтай краіне не захоўваюцца правы чалавека і ў асобных лагерах для прыёму бежанцаў. Людзі ўтрымліваюцца там ва ўмовах, «ніжэйшых за турэмныя стандарты», што нярэдка вымушае мігрантаў на такія крайнія меры, як аб'яўленне галадоўкі ў знак пратэсту.

Нягледзячы на неадпаведнасць міжнародным стандартам у галіне правоў чалавека практыкі ўтрымання мігрантаў пад вартай, Канада працягвае трымаць іх у турэмным зняволенні без прад'яўлення якіх-небудзь абвінавачванняў. Паводле інфармацыі праваабарончых арганізацый, больш чым 200 бежанцаў знаходзілася ў зняволенні, некаторыя з якіх прыехалі ў гэтую краіну шмат гадоў таму.

Сілавымі метадамі падаўляецца права на свабоду выказвання і права на свабоду сходаў. Прыкладаў тут шмат. Так, улады Латвіі праводзяць мэтанакіраваную палітыку ўзмацнення цэнзуры і зачысткі інфармацыйнага поля, пазбаўляючы насельніцтва магчымасці атрымання інфармацыі з альтэрнатыўных крыніц. У прыватнасці, заблакіравана беларускае тэлебачанне і партал навін belta.by. Сацыяльныя сеткі і СМІ падпадаюць пад цэнзуру, да іх карыстальнікаў і ўладальнікаў прымяняюць адміністрацыйныя і крымінальныя санкцыі. Грамадзяне і неграмадзяне Латвіі пазбаўлены альтэрнатыўных крыніц інфармацыі — прадугледжаны штраф за прагляд забароненых СМІ ў памеры 700 еўра. Юрыдычныя асобы могуць быць аштрафаваны на 14 тысяч еўра за распаўсюджванне праграмы перадач забароненых тэлеканалаў або іх трансляцыю. У заявах з высокіх трыбун апошнім часам усё часцей праяўляюцца рысы нацызму. Ненавісніцкія выказванні сталі нормай для палітычных дзеячаў Латвіі. Публічныя абразы і прыніжэнні распальваюць варожасць і дыскрымінацыю ў грамадстве.

### ПУНКТ ПОШУКУ

Як лічыць Уладзімір Макей, абсурднасць сітуацыі ў тым, што заходнія ўпраўленцы, чыя палітыка прывяла да адпаведных праблем, працягваюць выдаваць сабе самім мандат на варожую дзейнасць у адносінах да іншых суверэнных краін, зразумела, без уліку інтарэсаў свайго грамадства. «У пагоні за ўладай любой цаной яны працягваюць адкрыта злачынную дзейнасць па прымяненні санкцый супраць непажаданых дзяржаў. Парадаксальна, але першымі, хто адчуў на сабе ўдушлівы эфект ад санкцый, сталі менавіта грамадзяне заходніх дзяржаў, — заўважыў кіраўнік МЗС. — Рытарычнае пытанне напрошваецца само сабой: а хто-небудзь пытаўся дазволу ў гэтых грамадзян на правядзенне такой палітыкі дзяржавы? Хто-небудзь папярэджваў іх аб наступствах, якія лягуць на іх плечы? Адказ відавочны... Ніхто».

Уладзімір Макей адзначыў, што Беларусь неаднаразова ўказвала на недапушчальнасць маніпулявання правамі чалавека ў якасці палітычнага метаду выбудоўвання міждзяржаўных узаемадносін. «Ідэальных краін у свеце няма з-за аб'ектыўных прычын. Пытанні правоў чалавека ў любым грамадстве павінны аб'ядноўваць, а не раз'ядноўваць. Правы чалавека павінны з'яўляцца пунктам пошуку прымальных рашэнняў, а не прычынай для разладу», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

Пазіцыя МЗС Беларусі застаецца нязменнай і зыходзіць з разумення таго, што міжнароднае вымярэнне ў пытаннях выканання правоў чалавека, якое ўключае міжнародныя пагадненні і адпаведныя арганізацыі і ўстановы, у тым ліку ў рамках ААН, павінна выкарыстоўвацца для ўдасканалення нацыянальных сістэм выключна праз інструменты добраахвотнага міжнароднага супрацоўніцтва на прынцыпах суверэннай роўнасці дзяржаў і неўмяшання ва ўнутраныя справы. «Любыя дзеянні па вызначэнні міжнароднымі інстытутамі чэмпіёнаў і аўтсайдараў у пытаннях захавання правоў чалавека з'яўляюцца выхадам гэтых інстытутаў за межы іх паўнамоцтваў і супярэчаць самой сутнасці міжнароднага супрацоўніцтва», — пераканалі ў МЗС.

Пастаянны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь пры аддзяленні ААН у Жэневе Ларыса Бельская падчас 50-й сесіі Савета па правах чалавека ўзяла ўдзел у дыскусіі са спецыяльным дакладчыкам па сучасных формах расізму. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Міністэрства замежных спраў. Беларускі дыпламат прыцягнула ўвагу да маштабнай дыскрымінацыі ў краінах ЕС рускамоўных грамадзян, у тым ліку беларусаў, у розных сферах жыццядзейнасці — у перамяшчэнні, адукацыі, культуры, спорце, ахове здароўя, фінансах. Яна адзначыла, што заахвочванне русафобіі і санкцыйная апантанасць заходніх палітыкаў садзейнічаюць распальванню міжцывілізацыйнага канфлікту ў Еўропе.

Ларыса Бельская звярнула ўвагу спецдакладчыка на тое, што ў шэрагу заходніх і іншых краін названыя працэсы развіваюцца пры небяспечным заахвочванні на дзяржаўным узроўні дзейнасці ваенізаваных груп, якія прапаведуюць міжнацыянальную і расавую нянавісць, ідэалогію неанацызму. «Беларусь заклікала спецдакладчыка аб'ектыўна і непрадузята ацэньваць гэтыя працэсы і самым рашучым чынам рэагаваць на факты дыскрымінацыі беларусаў і рускіх, дабівацца аднаўлення іх правоў», — падкрэслілі ў знешнепалітычным ведамстве. Беларуская дэлегацыя запрасіла савет азнаёміцца з чарговым дакладам МЗС па найбольш рэзанансных выпадках парушэння правоў чалавека ў асобных краінах свету.

**Захар БУРАК.**

# З ЯКІМІ КАРТКАМІ СЁЛЕТА МЫ ЕДЗЕМ ЗА МЯЖУ?

## Цяпер у трэндзе кітайскі «пластык» UnionPay і айчынны «БЕЛКАРТ-Мір»

**Бягучая сітуацыя змяніла звыклыя схемы падарожнікаў, менавіта тых, хто выязджае за мяжу. Абмежаванні ў разліках па картках Visa і Mastercard рэзка павялічылі папулярнасць картак кітайскай плацежнай сістэмы UnionPay. Але гэта не эквівалентная замена, як можа падацца на першы погляд. Эксперт плацежнага рынку, дырэктар правайдара электронных плацяжоў Assist Belarus Вячаслаў СЕНІН дапаможа разабрацца, якія карткі цяпер можна выкарыстоўваць за мяжой, каб не адчуваць праблем з разлікамі.**



### 20 гадоў таму

Для пачатку здзейснім кароткі экскурс у свет грашовых разлікаў Кітая. Кампанія China UnionPay была створана ў 2002 годзе па ініцыятыве Народнага банка Кітая і ўжо ў 2005 годзе сталаператварацца ў буйнога міжнароднага гульца. Характэрны той факт, што ў 2010 годзе UnionPay заняла першае месца ў свеце па колькасці выпушчаных плацежных картак. У 2015 годзе плацежная сістэма UnionPay International упэўнена заняла лідзіруючую пазіцыю па колькасці аперацый па картках, апярэдзіўшы плацежную сістэму Visa. Доля картак UnionPay у 2018 годзе склала 45 % ад агульнай колькасці ў свеце.

У Беларусі плацежная сістэма UnionPay International прысутнічае з 2011 года, аднак да сакавіка 2022 года вынікі яе дзейнасці на рынку Беларусі не былі такімі ўражальнымі, як у сусветных маштабах.

### АЖЫЯТАЖНЫ ПОПЫТ

Трэба адзначыць, што ўвядзенне санкцый плацежных сістэм Visa і Mastercard для расійскіх і беларускіх банкаў рэзка скараціла магчымасці прыёму картак гэтых сістэм за мяжой. І вось тут на фінансавай арэне актывізавалася афармленне картак UnionPay.

Наш эксперт звярнуў увагу на тое, што ў нашай краіне плацежныя карткі UnionPay выпускае толькі адна фінансавая ўстанова — камерцыйны банк. Аднак Белгазпрамбанк не чакаў такога рэзкага павелічэння попыту на кітайскія карткі ў пачатку 2022 года, і бюджэтныя варыянты карткі UnionPay Classic былі часова прыпынены ў выпуску з-за адсутнасці пластыку і адноўлены толькі 29 чэрвеня 2022 года. Цяпер кліенты могуць аформіць прэміяльную картку UnionPay Platinum за 135 беларускіх рублёў у аддзяленнях банка і 101 рубель у інтэрнэт-банкінгу. Таксама кліентам цяпер даступны бюджэтны варыянт UnionPay Classic за 50 беларускіх рублёў у аддзяленнях банка і 37,50 рубля ў інтэрнэт-банкінгу. Не зусім танна, але ж...

«Беларусы прывыклі выкарыстоўваць карткі Visa і Mastercard для разлікаў за мяжой. Аднак не варта залішне насцярожана ставіцца да папулярных сёння кітайскіх картак. Плацежная сістэма UnionPay супрацоўнічае з больш чым 2500 фінансавымі інстытутамі ў 180 краінах і падтрымлівае правядзенне трансгранічных плацяжоў — што актуальна для падарожнікаў», — паведаміў наш эксперт плацежнага рынку Вячаслаў Сенін.

«Разам з тым, нельга прытрымлівацца іншай крайнасці і цалкам спадзявацца на ўражальную статыстыку сусветнага распаўсюджвання картак UnionPay. Бо часта прысутнасць плацежнай сістэмы UnionPay ў якой-небудзь краіне прадстаўлена ўсяго некалькімі банкамі. У буйных гандлёвых цэнтрах вы амаль напэўна зможаце разлічыцца карткай UnionPay, аднак у больш дробных гандлёвых сетках магчымы адмовы ў яе прыёме да аплаты. Напрыклад, Белгазпрамбанк першапачаткова пазіцыянаваў карткі UnionPay як плацежны інструмент для падарожнікаў, што накіроўваюцца ў КНР. Улічваючы бягучыя абмежаванні разлікаў па картках Visa і Mastercard, а таксама геаграфію распаўсюджвання картак кітайскай плацежнай сістэмы, магчымае афармленне і выкарыстанне картак UnionPay пры паездцы за мяжу. Аднак папярэдне варта азнаёміцца на сайце плацежнай сістэмы UnionPay з магчымасцямі аплаты ў краіне вашага падарожжа», — дае рэкамендацыі спецыяліст.

Варта таксама ўлічыць, што той жа банк праводзіць разлікі з сістэмай UnionPay у еўра. Гэта значыць, аперацыя ў валюце краіны знаходжання канвертуецца ў еўра і затым сума аперацыі ў еўра спісваецца з вашага рахунку. Таму для мінімізацыі колькасці канверсій і рызыкі змены курсу валют мае сэнс адкрыццё рахунку менавіта ў еўра.

### Лыжка дзёгцю

Ёсць яшчэ адна асаблівасць карткам UnionPay, якая можа злёгку засмуціць анлайн-шопераў. Белгазпрамбанк анансаваў, што плацежныя карткі Union Pay недаступныя для здзяйснення аперацый у сетцы Інтэрнэт.

«Рэзюмуючы, адзначу, што ў выпадку разлікаў па картцы UnionPay не даводзіцца разлічваць на звыклую ўніверсальнасць выкарыстання, уласцівую карткам Visa і Mastercard. Аднак папярэдняе вывучэнне інфармацыі па краіне падарожжа дазволіць пазбегнуць няспраўных сітуацый з цяжкасцямі ў разліках па картцы UnionPay. Такі варыянт плацежнага інструмента цалкам дарэчны для выкарыстання», — адзначыў Вячаслаў Сенін.

### Плацежная сістэма «Мір» працуе ў дзясятку краін

Ва ўмовах абмежаванняў па міжнародных разліках з'явіўся яшчэ адзін альтэрнатыўны варыянт карткі для паездкі — плацежная картка расійскай плацежнай сістэмы «Мір». Разлічыцца такой карткай можна не па ўсім свеце, а ў абмежаванай колькасці краін, такіх як Турцыя, В'етнам, Беларусь, Арменія, Узбекістан, Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан, Паўднёвая Асецiя і Абхазія. Аднак калі вам патрэбна будзе паездка ў адну з гэтых краін, варыянт карткі «Мір» будзе прыдатным.

### «БЕЛКАРТ-Мір» сябруе з інтэрнэтам

Вынікам супрацоўніцтва плацежных сістэм БЕЛКАРТ і «Мір» стала з'яўленне на тэрыторыі Беларусі картак «БЕЛКАРТ-Мір» з 2020 года. Гэтыя карткі выпускаюцца ў рамках плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ, але прымаюцца да разлікаў ва ўсіх краінах, у якіх прадстаўлена плацежная сістэма «Мір». Трымальнік карткі «БЕЛКАРТ-Мір» можа разлічыцца або зняць наяўныя грошы ў любым месцы або прыладзе, дзе ёсць лагатып MIR.

Акрамя разлікаў у звычайных крамах і зняцця наяўных у банкаматах, картку «БЕЛКАРТ-Мір» можна выкарыстоўваць для разлікаў у сетцы Інтэрнэт, як на тэрыторыі нашай краіны, так і на сайтах, якія абслугоўваюць банкі — удзельнікі плацежнай сістэмы «Мір».

Карткі «БЕЛКАРТ-Мір» выпускаюць восем беларускіх банкаў. Кошт абслугоўвання такіх картак невысокі, а ў асобных банках плата за яго наогул адсутнічае. Безумоўна, калі падарожнік накіроўваецца ў адну з вышэйзгаданых краін, дзе прысутнічае плацежная сістэма «Мір», ідэальным варыянтам будзе адкрыццё і выкарыстанне плацежнай карткі «БЕЛКАРТ-Мір».

«Тым, хто выязджае за мяжу, не варта моцна хвалявацца з нагоды ўзніклых абмежаванняў у разліках, — падводзіць вынік абмеркавання па выбары плацежнага сродку Вячаслаў Сенін. — Існуюць два даступныя варыянты, альтэрнатыўныя карткі Visa і Mastercard, — карткі UnionPay і «БЕЛКАРТ-Мір». Калі вам важная шырокая геаграфія разлікаў, то рэкамендуецца скарыстацца карткай UnionPay. Пры гэтым трэба разумець рызыкі абмежаванай колькасці банкаў, якія абслугоўваюць гандлёвыя сеткі за мяжой або ў якіх вы можаце зняць наяўныя грошы. У такім выпадку перад паездкай трэба сабраць як мага больш інфармацыі па распаўсюджанні плацежнай сістэмы UnionPay у краіне вашага знаходжання.

Калі ж вам прадбачыцца паездка ў Турцыю, В'етнам, Расію, Арменію, Узбекістан, Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан, Паўднёвую Асецію або Абхазію, лепш скарыстацца зручнай і бюджэтнай карткай «БЕЛКАРТ-Мір». Падобна на тое, што на дадзеным этапе нашым падарожнікам трэба будзе выбіраць з двух варыянтаў безнаяўных «кашалькоў». Тут, як той казаў, трэцяга не дадзена.

**Сяргей КУРКАЧ.**
**Фота Маргарыты ПАЛЮХОВІЧ.**


## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

**информирует о проведении 26.07.2022 открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Могилевдрев»**

**Лот № 1:** грузовой автомобиль ЗИЛ 131, 1983 г. в, р/з АВ 1407-6, № кузова (рама) 556103, цвет – зеленый, тип – грузовой фургон, инв. № 2814. Местонахождение: г. Могилев, пер. Гаражный, 10. **Начальная цена продажи – 4 080,00 бел. руб. с НДС.**

**Лот № 2:** грузовой автомобиль специальный лесовоз УРАЛ 4320, 1982 г. в, р/з ТС 0450, цвет – зеленый, VIN кузова 012462, инв. № 002593. Местонахождение: Могилевская обл, г. Быхов, ул. Железнодорожная, 19. **Начальная цена продажи – 10 440,00 бел. руб. с НДС.**

**Аукцион состоится 26 июля 2022 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона ino.by. Информация о предыдущем была размещена в номере газеты «Звязда» от 21.05.22 г.

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 351, 352, **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by**

## Государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» сообщает,

что в связи с технической ошибкой читать лот № 1 в следующей редакции: *Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 222/С-39386, общей площадью 450,6 кв. м, наименование – здание гаража, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), расположенное по адресу: Витебская обл., Поставский р-н, г. Поставы, ул. Космонавтов, 40У, на земельном участке с кадастровым № 224050100002000207, расположенном по адресу: Витебская обл., Поставский р-н, г. Поставы, ул. Космонавтов, 40В (общее долевое право аренды, доля в праве 17/100). Нач. цена: 42 240,00 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 4 224,00 бел. руб.* Аукцион по продаже лота № 1, принадлежащего ОАО «Витебскоблавтотранс», назначен на 27.07.2022 в 12.00, опубликован в газете «Звязда» 25.06.2022, на сайте Витебского облисполкома http://vitebsk-region.gov.by/ru/ 24.06.2022. Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63. УНП 390477566.

## ДОПОЛНЕНИЯ И ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ,

опубликованную в газете «Звязда» от 17 декабря 2021 года,
с изменениями и дополнениями,
опубликованными в газете «Звязда» от 18 февраля 2022 года,
от 26 мая 2022 года, по объекту
«Жилищный комплекс повышенной комфортности с объектами социально-общественного назначения и подземной парковкой в квартале улиц Немига – Коллекторная – К. Цеткин»

Внести следующие изменения и дополнения в текст проектной декларации:

1. Строку «61 (шестьдесят одна) однокомнатная квартира, расположенная в жилой секции 1/2 (по проекту):» заменить на «62 (шестьдесят две) однокомнатных квартиры, расположенных в жилой секции 1/2 (по проекту):».

2. Перечень однокомнатных квартир, предлагаемых к приобретению по договору создания объектов долевого строительства, дополнить квартирой:

- 1 (одна) однокомнатная квартира по проекту № 140 общей площадью по проекту 325,95 кв. метров на 19-м этаже. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1277,00 долларам США.

УНП 691532819

## ООО «СпецРеализация»

**объявляет о проведении первых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Современные направления», УНП 690621676, Минская область, Несвижский район, ул. Строителей, д. 1, находящегося в процедуре ликвидации.**

***Дата и время проведения торгов***: **20 июля 2022 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 9 июля 2022 года по 18 июля 2022 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «Современные направления» (УНП 690621676)** в лице ликвидатора – директора ООО «Юридическое агентство «КлеверКонсалт» Колыско Артема Андреевича, тел. 8 (029) 399 20 40.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 10 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на Интеренет-сайте http://www.specrealization.by//». Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 77 (29699) за 21.04.2022 г.

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего ООО «Юрстайл групп» (220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404) проводит в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) на основании определения Экономического суда Минской области от 27.06.2022 по делу № 290-17Б/2019 открытый аукцион по продаже имущества ДУП «Передвижная механизированная колонна № 185» УП «Минскоблсельстрой» (222410, Минская область, г. Вилейка, ул. Чапаева, 50, УНП 690018995) в составе:

**Лот № 1:**

**пилорама** *(составные части и принадлежности: 3 (три) погреба, 2 (две) пристройки, 3 (три) склада, столярный цех, подвал, покрытие)* **с инв. № 631/С-58063 общей площадью 517,3 кв. м;**

**заправочная ГСМ** *(составные части и принадлежности: склад, диспетчерская )* **с инв. № 631/С-58059 общей площадью 9,1 кв. м;**

**трансформаторная подстанция (ТП-32)** *(составные части и принадлежности: электрические сети)* **с инв. № 631/С-66894 общей площадью 35,8 кв. м.**

**Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Вилейка, пер. Колхозный, 11/1, 4, 2;**

**бункер с 2-мя циклонами для удаления древесных отходов, адрес местонахождения: Минская область, г. Вилейка, пос. Чапаева, 50.**

Начальная цена без НДС – **240 780,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **24 078,00** бел. руб.).

**Лот № 2: административное здание** *(составные части и принадлежности: пристройка, туалет)* **с инв. № 631/С-13805 общей площадью 685,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, г. Вилейка, пер. Колхозный, 11/8.**

Начальная цена без НДС – **170 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **17 000,00** бел. руб.).

**Лот № 3:**

**склад цемента** *(составные части и принадлежности: навес, подвал)* **с инв. № 631/С-66993 общей площадью 23,5 кв. м;**

**склад извести** *(составные части и принадлежности: навес, подвал, емкость)* **с инв. № 631/С-66992 общей площадью 128,4 кв. м;**

**склад с инв. № 631/С-66994 общей площадью 130,7 кв. м;**

**лесопильный цех с инв. № 631/С-66991 общей площадью 476,6 кв. м.**

**Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Вилейка, пер. Колхозный, 11/5, 7, 3, 6;**

**силосные емкости для хранения цемента в составе:** силос цемента 4 шт. с **инв. № 4214274, адрес местонахождения: Минская область, г. Вилейка, пос. Чапаева, 50.**

Начальная цена без НДС – **112 800,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **11 280,00** бел. руб.).

**Лот № 4: гараж-мастерские с инв. № 631/С-58065 общей площадью 1633,9 кв. м, расположенный по адресу: Минская область, г. Вилейка, пер. Колхозный, 11.**

Начальная цена без НДС – **142 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **14 200,00** бел. руб.).

**Недвижимое имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 621350100005000936 площадью 6,6550 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Вилейка, пер. Колхозный, 11, для обслуживания Объектов будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.**

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере 4 (четырех) процентов от цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на публикацию.**

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяются Законом Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Аукцион состоится **15.08.2022 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.08.2022** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра (8029) 685 36 77.**

УНП 690018995

# «ЗАСЛУЖЫЎ ЧАЛАВЕК, КАБ ЛЯЖАЦЬ У ЧЫСТЫМ МЕСЦЫ...»

## Дагледзець старыя вясковыя могілкі — чый гэта клопат?

**На малой радзіме беларускага пісьменніка Пятра Глебкі ў вёсцы Вялікая Уса, што на Уздзеншчыне, месцяцца старыя могілкі. Там, побач з сучаснымі помнікамі, у траве хаваюцца невысокія камяні, якія даўней ставілі на месцы пахаванняў. На большасці з іх ужо складана разабраць надпісы. Але і тым, дзе ўдалося, больш за сто гадоў. І нядзіўна, бо самой вёсцы — больш як чатырыста.**

### ПЕРАД ЛЮДЗЬМІ СОРАМНА

Пра старыя могілкі мне распавяла, а потым і прывяла туды на экскурсію 80-гадовая ўраджэнка Малой Усы Галіна Рамановіч, былая настаўніца. На Макавей 14 жніўня 1943 года немцы спалілі яе родную вёсачку разам з суседняй Вялікай Усай. А 9-месячную Галю разам з маці, бабуляй, дзядулем ды астатнімі вуслянамі пагналі ў Германію.

Як тэатр пачынаецца з вешалкі, так могілкі — з агароджы. «Вунь, зірніце, папрыбівалі дошкі абы-як, крыва. Я адразу думала, што яны адарваліся, а потым падышла бліжэй, паглядзела — не, усе трывала прымацаваныя, але чамусьці коса. Тут жа, у вёсцы, ёсць прыватная лесапільня. Яе ўласнікі рэжуць наш лес, разбіваюць цяжкагрузнымі машынамі, на якіх возяць бярвенне, нашу дарогу. А нармальнай агароджы вакол могілак няма... Калі зносілі ферму ў Малой Усе, адтуль забралі бетонную агароджу і перанеслі на новыя вуслянскія могілкі. А ў мяне душа баліць за гэтыя, таму што тут закінута ўсё. Старыя могілкі павінны быць узорнымі. Але, самі ж бачыце, дагледжаныя толькі тыя магілы, дзе жывыя нашчадкі. А іх з кожным годам становіцца ўсё менш і менш... Тут жа і месца намоленае, даўней на могілках цэркаўка Святога Георгія была (паказвае месца), якую спалілі немцы. Баба Ганька, жонка майго стрыечнага брата, расказвала, што ў вайну жанчыны з дзвюх вёсак ткалі вялікае палатно. Верылі, што калі зрабіць абярэг за суткі, занесці ў царкву і памаліцца за тых, хто на фронце, то яны застануцца жывыя. А адна жанчына з Вялікай Усы на калёнях дапаўзла аж да ўздзенскай царквы, каб сын з вайны вярнуўся жывы. Не ведаю, як склаўся лёс таго хлопца. Але тут, на гэтых могілках, пахавана шмат былых вязняў, удзельнікаў войнаў. Фёдар Сямёнавіч Арамаў, Іван Якаўлевіч Ждановіч, Іван Мікалаевіч Нісцюк — гэта толькі тыя, каго я добра ведала. На хаце майго стрыечнага брата ў Малой Усе і дагэтуль вісіць шыльда, што там пражываў удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пра бацьку майго можна ў інтэрнэце ўсё знайсці: якія ў яго ўзнагароды, у якіх баях удзельнічаў. Ён пайшоў на сенакос у Таўстуху, дзе сустрэў партызанаў і, не раздумваючы, сышоў з імі. Ваяваў у атрадзе «Буравеснік», біў нямецкія абозы на Слуцкай шашы. Пасля вызвалення краіны тату як спрактыкаванаму чыгуначніку даверылі аднаўляць нашу беларускую чыгунку. Заслужыў чалавек, каб ляжаць у чыстым месцы?.. Тое, што ад мяне залежыць, я раблю. Свае магілкі я яшчэ магу дагледзець, дзеці і ўнукі дапамагаюць. Але ж колькі побач магіл, якіх няма каму глядзець, яны зарастаюць травой. Дык трэба ж, каб дзяржава паклапацілася пра іх, ушанавала іх памяць».

Галіна Фёдараўна звяртае маю ўвагу на сухое дрэва, на бярозку, што нахілілася над магіламі. «Ведаю, людзі звярталіся ў сельсавет, каб пачысцілі могілкі ад старых дрэў... Прыязджалі, спілавалі некалькі бяроз, але цалкам да ладу справу не давялі. Перад уваходам на могілкі напісана, што агароджа павінна быць не вышэй, чым 40 сантыметраў. У маіх стаіць высокая. Па цётцы, дык аж 46 гадоў агароджы. Я б яе памяняла, бо і фарбаваць дрэнна. Але ж не прыбіраю, бо гэта адзіная надзея, што калі, не дай бог, паваліцца дрэва, дык агароджа затрымае і не будзе пабіты помнік. Падчас апошняга ўрагану сук адваліўся і ўпаў паміж агароджамі маёй мамы і цёткі. Унучка папрасіла сына суседкі, той дапамог распілаваць яго і вынесці. Дык людзі казалі: «От, вы шчаслівыя. Гэта ж трэба, каб упала роўненька паміж агароджамі». Проста пашанцавала. А ў людзей жа тут троху і папсавала помнікі. Казалі, што на новых могілках наогул тоўстае дрэва вывернула разам з магілай».

Галіна Фёдараўна распавяла, што даўней, яшчэ калі ўзначальвала грамадскую арганізацыю былых вязняў, звярталася ва Уздзенскі райвыканкам. «Тады па ўсёй краіне праходзіла акцыя, прысвечаная спаленым вёскам, дык я напісала проста на нашым бланку, што ў такім непрыглядным стане ў нас старыя могілкі. Але мне нават не адказалі на тое пісьмо. Хочацца верыць, што хоць у 2022-м — Годзе гістарычнай памяці — мясцовыя ўлады звярнуць увагу на нашы старыя могілкі. Цудоўна было б, калі б сабралі інфармацыю пра ўсіх, хто тут пахаваны, падключылі школьнікаў у рамках краязнаўчай работы.

Вялікая Уса — радзіма Пятра Глебкі, тут нават ёсць вуліца ў яго гонар. Гэта ж можна старыя могілкі ўвесці ў план экскурсіі па Уздзенскім раёне. Дык няма ж як прывесці тых турыстаў, бо сорамна».

### «ЗАКЛІКАЕМ ВЫХОДЗІЦЬ НА СУБОТНІКІ»

Калі я пераказала крык душы Галіны Рамановіч часова выконваючаму абавязкі старшыні Уздзенскага сельскага Савета Аляксандру Унуковічу, ён папрасіў мяне пераслаць яму зварот. І паабяцаў у хуткім часе звярнуць больш увагі менавіта на старыя могілкі. Маўляў, «улічым крытычныя заўвагі пажылога чалавека і будзем працаваць над тым, каб палепшыць іх знешні выгляд».



Галіна РАМАНОВІЧ паказвае векавыя надмагільныя камяні, якія зараслі травой.

Пры гэтым дадаў, што, на жаль, не заўсёды ўсё залежыць толькі ад яго жадання. «На тэрыторыі нашага сельсавета размешчаны 21 могілкі. Ні асобных фінансавых сродкаў для іх утрымання і абслугоўвання, ні брыгады, ні тэхнікі мы не маем. Таму наводзім парадак па меры магчымасці сваімі сіламі — а гэта ўласна я і адзін рабочы, якога ў летні перыяд бяром па дагаворы падраду. Пакуль абкосіш па разу ўсе могілкі ўнутры па перыметры, ужо не відаць і следу, што там касілася. Прашу дапамогі — калі ад ЖКГ, калі ад мясцовых гаспадарак, на тэрыторыі якіх размешчаны гэтыя могілкі. Але самі разумееце — у сельскагаспадарчых прадпрыемстваў іншыя мэты, ім трэба вырасціць і сабраць ураджай, дапамога калі аказваецца, а калі і не. Таму перапанаўчая просьба да мясцовых жыхароў — таксама браць удзел у навядзенні парадку ўласнымі сіламі, арганізоўваць суботнікі. Я не так доўга працую на гэтай пасадзе, але адзінкі выходзілі на суботнік, калі мы запрашалі».

### ХТО ВЫДАЛЯЕ АВАРЫЙНЫЯ ДРЭВЫ?

«За апошнія паўгода, дзякуючы падтрымцы райвыканкама, мы выдалілі шмат аварыйных дрэў на могілках — гэтаму пытанню аддаецца павышаная ўвага, — кажа Аляксандр Унуковіч. — У прыватнасці, у канцы мінулага года ў аграгарадку Зенькавічы практычна ўсю новую частку могілак вычысцілі ад старых дрэў. У тым ліку і за кошт сельвыканкама. Мясцовае насельніцтва адгукнулася: паўдзельнічалі, скідваліся грашыма і наймалі альпіністаў. Падобную работу праводзілі мы і па іншых населеных пунктах — у аграгарадку Сямёнавічы, вёсках Боркі, Бярвішчы. З апошняга — нядаўна спілавалі пяць аварыйных дрэў у вёсцы Падсадскія. Тут таксама хочацца звярнуцца да нашчадкаў памерлых. Без іх дапамогі ўсе дрэвы, якія прасіліся на выдаленне, з могілак мы хутка не прыбяром. Бо сродкі, якія выдзяляюцца на добраўпарадкаванне вёсак абмежаваныя. Таму кропкава выдаляем самыя аварыйныя. Больш за тое, у законе прапісана, што тыя дрэвы, якія выраслі ў межах агароджы магілы, павінны выдаляцца за кошт сваякоў.

— А ў Вялікай Усе выдалялі якія-небудзь дрэвы?

— Так, летась выдалялі дзве аварыйныя бярозы за кошт сельвыканкама на новых могілках.

— А калі ў чалавека над магілай навісае дрэва, ён баіцца, што яно ўпадзе і пашкодзіць помнік, якія яго дзеянні: тэлефанаваць у сельсавет ці самому наймаць кагосьці?

— У любым выпадку сельвыканкаму трэба паведаміць, што такія работы будуць праводзіцца. Чалавек можа самастойна звярнуцца ў фірму, якая займаецца прамысловым альпінізмам, і за свой кошт арганізаваць выдаленне дрэва. Спецыфіка могілак у тым, што яго не так проста выдаліць, усё трэба рабіць акуратна, па галінцы. Гэтым павінны займацца прафесіяналы. Інакш нават калі невялікая галіна ўпадзе з вялікай вышыні, яна можа пашкодзіць помнік. У інтэрнэце дзясяткі прапаноў, можна выбраць самую танную. Альбо звярнуцца ў сельвыканкам — падкажам кантакты тых, з кім мы працуем. Дрэвы, якія ўпалі, стараемся аператыўна (сваімі сіламі і просім, падключаем лясгасы) распілоўваць на часткі і вывозіць з тэрыторыі могілак, прыбіраем галіны.

### КАЛІ НАШЧАДКАЎ НЯМА...

«Драўляная агароджа патрабуе асаблівага догляду і доўга не праслужыць, таму мы стараемся ставіць бетонныя. У прыватнасці, сёлета мяняем старую драўляную агароджу цалкам на бетонную ў аграгарадку Сямёнавічы. Там вялікія могілкі, больш за 600 метраў пагонных па перыметры. Гэта ўсё на бягучы год, што мы пакуль можам сабе дазволіць у плане агароджаў. Бо работы праводзяцца па меры выдзялення фінансавых сродкаў. Будзе дадатковае фінансаванне — няма пытання, працягнем работу».

— Аляксандр Віктаравіч, а хто мусіць глядзець за пахаваннямі, калі нашчадкаў ужо няма?

— Згодна з Законам «Аб пахаванні і пахавальнай справе», магілы павінны даглядаць сваякі памерлых. Калі іх няма, то ў нейкай ступені гэта работа праводзіцца школамі і іншымі арганізацыямі. У прыватнасці, у вёсцы Каменка пахавана былая настаўніца, якая загінула ў час вайны. Мясцовая школа ўзяла шэфства над гэтай магілай і даглядае яе. Таксама на розных могілках устаноўлены 51 помнік людзям, загінулым падчас вайны. Рашэннем райвыканкама ўсе такія памятныя месцы замацаваныя за прадпрыемствамі, арганізацыямі раёна: дзесьці — за школай, дзесьці — за Следчым камітэтам... А ўвогуле, пакуль што большасць вясковых могілак у краіне знаходзіцца на балансе сельскіх Саветаў. Па законе, сельвыканкам мае права замацаваць за імі сабе на дапамогу яшчэ нейкія арганізацыі. Я гэта пытанне пакуль прапрацоўваю, буду абмяркоўваць у райвыканкаме. Праўда, не ведаю, ці ёсць цяпер у гэтым сэнс, бо згодна з новай рэдакцыяй Закона «Аб пахаванні і пахавальнай справе», да 2023 года ўсе вясковыя могілкі павінны быць перададзены на баланс спецыялізаваных арганізацый. І я лічу, што гэта правільна. Добраўпарадкаваннем могілак павінны займацца спецыяльна абучаныя людзі, як тое адбываецца ў гарадах.



Каб абгарадзіць 600 пагонных метраў могілак у аграгарадку Сямёнавічы, грошы знайшліся. А на маленькіх старых вуслянскіх плот ужо шмат гадоў стаіць з крыва прыбітымі дошкамі...

Калі я пісала матэрыял па звароце нашага чытача Аляксандра Матошкі з Расоншчыны «Апошні прыстанак у спісах не значыцца» (гл. «Звязду» ад 26.11.2021 г.), работнікі Янкавіцкага сельвыканкама таксама выказалі меркаванне, што было б больш парадку, каб пэўная спецарганізацыя ўзяла б на сябе адказнасць за вясковыя могілкі. Казалі, такі досвед ужо ёсць у Полацкім раёне. Трэба будзе з'ездзіць туды ў камандзіроўку і папытацца ў тамтэйшых жыхароў, ці задаволеныя яны такім раскладам.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК, фота аўтара.**

**Шаноўныя чытачы, калі і ў вас ёсць пытанні, якія хвалююць, пішыце! Паспрабуем разабрацца ў праблемнай сітуацыі разам. Наш паштовы адрас: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013; электронны адрас для зваротаў — zvarot@zviazda.by.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 64 (590)

# У ПАЛОНЕ СВЕТУ ДЭКАРАЦЫЙ

**Іван Рагацень паўстагоддзя аддаў рабоце ў кіно. Аднак ён належыць да людзей, якія ніколі не заяўляюць уголас пра зробленае. Можа, таму што мастак-дэкаратар — прафесія тых, хто, як правіла, заўсёды застаецца па-за кадрам... Наш герой удзельнічаў у стварэнні дзясяткаў кінастужак, працаваў з выдатнымі рэжысёрамі, сярод якіх былі Віктар Тураў, Валерый Рубінчык, Леў Голуб і іншыя, быў знаёмы і сябраваў з вядомымі акцёрамі. Але застаўся сціплым чалавекам, які сёння можа гадзінамі расказваць пра кіно і яго закулісce.**



## Сябры да кіно давядуць

Зараз на кінастудыі «Беларусьфільм» размясцілася персанальная выстаўка Івана Аляксандравіча «50 гадоў у кіно». Раней работы мастака-дэкаратара можна было ўбачыць у сценах Музея гісторыі беларускага кіно, а цяпер яны перамясціліся туды, дзе некалі ўсё пачыналася. Хоць не, усё ж варта адматаць яшчэ на некалькі гадоў раней... З дзяцінства хлопец любіў маляваць. Успамінае нават, як аднойчы быў гатовы адмовіцца ад паходу на спектакль, каб атрымаць замест гэтага каляровыя алоўкі. У выніку атрымаў і тое, і другое. У сям'і Іван нарадзіўся малодшым з пяці дзяцей.

— Бацькам было цяжка (тата пасля вайны меў інваліднасць па зроку), таму так і склалася. Сам я родам з вёскі Зарубчыкі Глыбоцкага раёна, што на Віцебшчыне. Старэйшая сястра Марыя была настаўніцай і спачатку забрала мяне да сябе, а потым і паспрыяла, каб вучыўся ў Ашмянскай школе-інтэрнаце, куды я трапіў у шостым класе, як не толькі адкрылі, — згадвае Іван Аляксандравіч. — Мне там падабалася, бо я хлопец быў актыўны. Стаў у школе афарміцелем стэндаў. Лёгка ўліўся ў калектыў. Там мы мелі магчымасць займацца музыкай, і я іграў у аркестры. Капельмайстар у нас быў патрабавальны: калі «даў пеўня» (збіўся), то адразу рыхтуйся чысціць трубу.

Ці то згаданы кіраўнік аркестра, ці ўвогуле вучоба далёка ад дому выхавалі ў юнаку дысцыпліну і патрабавальнасць да сябе. А інтарэс і жаданне развівацца з'явіліся ў яго пасля знаёмства з адным мастаком і прыходу ў іх школу выкладчыка малявання.

— З тым выкладчыкам мы пасябравалі. Ён даваў мне заданні, і я маляваў геаметрычныя фігуры, нацюрморты. А паколькі Ашмяны знаходзяцца за 50 кіламетраў ад Вільнюса, то, бывала, разам ездзілі туды ў нядзелю. Там я атрымліваў асалоду ад архітэктуры, а пасля прыязджаў і маляваў.

Трэба сказаць, што спробы юнага таленавітага хлопца заўважылі. І якраз у выпускным класе ў 1964 годзе пра яго напісалі артыкул «Мара аб блакітных гарадах» у газеце «Знамя юности». Пасля было паступленне на архітэктурны факультэт Політэхнічнага ўніверсітэта. Але ў пераходны перыяд пачаліся ў Івана Аляксандравіча праблемы са здароўем, бо ў яго парок сэрца. Узяў «акадэмку» спачатку, а потым усё ж працягнуў вучобу. На чацвёртым курсе сябры падкінулі яму ідэю падпрацаваць на «Беларусьфільме».

— Вучыўся са мной Слава Марухін (яго брат Юра быў аператарам), і мы сябравалі. Так з імі і прыйшоў у 1968 годзе на фільм «Мы з Вулканам», які здымалі ў Брэсцкай крэпасці. І ўжо пасля заканчэння ўніверсітэта, паколькі бачылі, што хлопец лёгкі на пад'ём і хутка ўсё выконваю, я атрымаў запрашэнне на карціну «Я, Францыск Скарына...». Гістарычны фільм, было шмат дэкарацый! І я загарэўся, — распавядае мастак. — Будавалі Ягелонскі ўніверсітэт, рабілі друкарскі станок. Так я і застаўся ў палоне свету дэкарацый.

Сёння на рахунку Івана Рагацені работа ў многіх знакамітых кінастужках і з вядомымі рэжысёрамі. «Магіла Льва» (В. Рубінчык), «Паланэз Агінскага» (Л. Голуб), «Полымя» (В. Чацверыкаў), «Шляхціц Завальня» (В. Тураў), «У жніўні 44-га» (М. Пташук), «Вольф Месінг» (У. Краснапольскі), «Угрумрака» (Ю. Мароз), спіс гэты можна працягваць доўга, але ніколі не ведаеш, ці былі б усе яны такімі, якімі ёсць, калі б не адданая і зладжаная работа кожнай каманды іх стваральнікаў.

## Самая каштоўная ўзнагарода

— Я літаральна з усімі рэжысёрамі супрацоўнічаў, хто працаваў на «Беларусьфільме», і ў кожнага спасціг сваю школу майстэрства. Кожны раз, калі пачынаецца работа над новым фільмам, я ўключаюся ў пошук інфармацыі і яе вывучэнне. Як здымалі «Вольфа Месінга», то я купіў кнігу «Архітэктура драўляных сінагог» і вывучаў яе, каб мець больш дакладнае ўяўленне пра гэтыя збудаванні. У тым жа інтэрнэце цяпер шмат усяго, але па сутнасці з дзесяці старонак напісанага табе можа спатрэбіцца ад сілы адна. Мяне цанілі заўсёды яшчэ і за тое, што ўсё рабіў уручную, а не на камп'ютары. Мне было дастаткова накід атрымаць ад мастака ці рэжысёра — і далей я ўсё дарабляю сам.

Згадвае мастак-дэкаратар і сваю работу ў Маскве, дзе рабіў дызайн экспазіцыі беларускага павільёна на выстаўцы «60 гадоў савецкага кіно»:

— Усе кінастудыі Савецкага Саюза прадставілі нешта сваё, і трэба было пабудаваць натурную дэкарацыю і ўнутры аздобіць павільён. Украінцы мазанку будавалі, хтосьці юрты рабіў, а мы вырашылі змайстраваць партызанскі лагер. Там быў мастак Ганкін Яўген Маркавіч, і з ім нам і трэба было рэалізаваць задуманае. Зрабілі ўсё, як належыць: зямлянку, кузню з мяхамі, печ змайстравалі, якую можна было нават тапіць. Я туды два лесавозы лесу прывёз. Пасля экспазіцыі масквічы да нашай дэкарацыі вадзілі наведвальнікаў яшчэ некалькі месяцаў і грошы заплацілі.

А Івана Аляксандравіча за тую работу ўзнагародзілі Залатым медалём ВДНГ СССР. Але калі чуеш, з якой любоўю і пяшчотай расказвае Іван Рагацень пра кожную кінастужку, да стварэння якой меў дачыненне, то разумееш, што ўсе яны і кожная пааcобку — яго вялікая і самая каштоўная ўзнагарода.

— Я проста працаваў і рабіў у кіно сваю справу і ніколі асабліва не высоўваўся. За жыццё я прайшоў пасляваенны час, заспеў камунізм, помню Карыбскі крызіс... Вось гэта 1973 год, — працягвае мой суразмоўнік, калі мы падыходзім да чарговага стэнда. — Рабілі па заказе Машэрава вялікую карціну. І там ёсць па сцэнарыі эпізод, калі танк прамой наводкай б'е па хаце. Купілі спецыяльна для гэтага хату, перавезлі ў патрэбнае месца. Камеру паставілі метраў за дзесяць ад месца выбуху. Піратэхнікі залажылі выбухоўку, падрэзалі бэлькі, але адзінае мы не ўлічылі: што не будзе куды падзецца выбуховай хвалі. І ўжо падчас здымак пайшла яна на камеру. Хоць і схавалі мы тэхніку ў калодзежы за шклом, але хваляй іх знесла. Пашкодзіўся дарагі аб'ектыў... А вось фільм «Франц і Паліна». Я для яго цэлую вёску пад Мінскам пабудаваў. Напярэдадні здымак мы прыехалі з рэжысёрам у тое месца, і я распавёў пра сваю ідэю. Ён заплюшчыў вочы, увявіў і даў дабро на рэалізацыю. Калі ж яе ў кадры спальвалі, то мне вельмі шкада было.

## Без фантазіі сапраўднага не створыш

Дарэчы, у «Францы і Паліне» мастак-дэкаратар нават зняўся ў ролі паліцая. А паколькі роля была з тэкстам, то па тым часе нават добра заплацілі за яе. За кожным з дзясяткаў фільмаў, дзе працаваў Іван Аляксандравіч, стаіць свая гісторыя. Даводзілася і зімой акопы капаць, і будаваць кабінет Сталіна, рабіць ваенны самалёт часоў Першай сусветнай вайны альбо майстраваць вадаспад...

— У 1976-м здымалі «Вянок санетаў» з Рубінчыкам. Паехалі ў Кёнігсберг і выбралі там натуру. А пасля ўзнікла пытанне, як уставіць скульптуру Пушкіна. Вага яе была больш за 150 кілаграмаў. Пачалі думаць, як падняць скульптуру. І тут я заўважыў лябёдку будаўнічага крана «Піянер». Толькі вось праблема, што ён з маторам, а значыць, патрэбна падключэнне да электрычнасці. Звярнуліся ў мясцовую раённую электрасетку, дзе нам дапамаглі. Заключылі дагавор і заплацілі 320 рублёў, а пасля нас падключылі да вузла непадалёку ад здымачнай пляцоўкі. Цяпер ёсць што ўспомніць.

Шмат эпізодаў у кадры і шмат уражанняў на здымачнай пляцоўцы. Кіно — гэта ж работа ў калектыве. І мастак-дэкаратар сутыкаецца ў тым ліку і з акцёрамі. Бывае, што людзі пачынаюць сябраваць, а потым з радасцю сустракаюцца на іншых карцінах. Так, Іван Аляксандравіч з цеплынёй успамінае свае знаёмствы, сустрэчы і работу з Уладзіславам Галкіным, са Святланай Івановай, Львом Дуравым, да якога нават ездзіў у Маскву ў госці, і з мноствам іншых цікавых людзей.

**Собственник имущества:** ОАО «Торфопредприятие Днепровское», 213332, д. Годылево, Быховский р-н., Могилевская обл., ул. Гасана, 12, УНП 700083371, тел. для осмотра объектов продажи +375336438989.

**Организатор торгов:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1, сайт: www.mogilev.cci.by/

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лоты №№ 1, 2, 3, 4 продаются без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, представившие организатору торгов, в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

**Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте продавца по адресу: www.mogilevcci.by.**

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты за предметы торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся 10 августа 2022 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104. Последний срок подачи заявления – 9 августа 2022 до 12.00.

Регистрация участников торгов 10 августа 2022 с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 104, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778042, + 375296927492 (А1).

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона

ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 410/С-15943 (назначение – здание нежилое, наименование – склад) общей площадью 387,5 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1Н.

Лот № 2 расположен на земельном участке с кадастровым № 420850100001011574 площадью 0,2717 га (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения (для строительства и обслуживания склада с рампой)), расположенном по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1Н. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема), код 2.4, площадью 0,2717 га.

Начальная цена продажи лота 50 016 руб. (пятьдесят тысяч шестнадцать рублей) с учетом НДС.

Сумма задатка – 5 000 руб. (пять тысяч рублей)

Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Волковысский филиал), 231900, г. Волковыск, ул. Брестская, 32, тел. 8-01512-621-86

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 208, тел. 55-87-71

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 25 июля 2022 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник–четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 21 июля 2022 г. до 15.00**

*Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion*

## ДОПОЛНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по объекту: «Многоквартирный жилой дом с подземной автостоянкой и встроенными объектами обслуживания в границах ул. Пригородной, Гая»,** опубликованную в газете «Звязда» от 30.04.2022 № 84 (29706)

В связи с расторжением договоров, на условиях проектной декларации, опубликованной в газете «Звязда» от 30.04.2022 № 84 (29706), для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства, при заключении которых предпочтение отдается гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, организациях г. Минска, без выдачи направлений администрациями районов г. Минска дополнительно предлагаются 2 жилых помещения (без выполнения внутренних отделочных работ) с учетом приобретения машино-места, в том числе:

- 1 (одна) двухкомнатная квартира общей площадью 65,28 кв. метров,
- 1 (одна) трехкомнатная квартира общей площадью 79,47 кв. метров.

Предметом договора на указанные помещения будет являться долевое строительство квартиры и машино-места.

Документы для заключения договоров на указанные квартиры будут приниматься с **15 июля 2022 года по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 7.**

УНП 190580566

## Извещение о проведении электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона (оператор ЭТП)** | ООО «ИПМ-Консалт оценка» (УНП 191224638), г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «КовалевТранс» (УНП 491327139), Минская обл. Минский р-он, д. Обчак, здание бывшей 8-летней школы – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 246-13Б/2017 в экономическом суде Минской области |
| **Антикризисный управляющий** | ООО «Управляющая компания «Экстраюст» (УНП 192044227), Минская обл., Минский р-н, с/с Щомыслицкий, д. 14 а/1-1, каб. 1-53, район аг. Озерцо. Тел. +375 (29) 6697469 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

**Административно-торговое помещение 3Н**, общ. пл. 95,4 кв. м, инв. номер 500/D-129122. Адрес **– г. Минск , ул. Романовская Слобода, 13-3Н**

**Начальная стоимость лота без НДС – 322 896,00 бел. руб.**
**Минимальная цена лота без НДС – 322 896,00 бел. руб.**

Размер шага составляет **5 (пять) процентов** от начальной цены лота

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по предварительному согласованию, контактный телефон +375296697469, Быстрицкая Инна Юрьевна

Лица, желающие принять участие в аукционе обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | 7 (семь) рабочих дней после проведения электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения торгов

**Дополнительная информация**

Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется постановлением Министерства экономики № 9 от 1 апреля 2019 года «Об электронных торгах по продаже имущества в процедурах экономической несостоятельности (банкротства)».

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Государственная регистрация договора купли-продажи и объектов недвижимости осуществляется Покупателем за свой счет

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 3% от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.ipmtorgi.by

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов – 12.08.2022 в 09.00**<br>**Окончание торгов – 12.08.2022 в 16.00** |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 11.07.2022 по 11.08.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail:** auction@ipmconsult.by

# «НА МЯДЗВЕДЗІ ЕДУ, ВОЎКАМ ПАДПІРАЮСЯ, А ВУЖОМ ПАДПЕРАЖУСЯ — ДЫ НІКОГА НЕ БАЮСЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Для таго каб адразу захапіцца гэтым краем, варта завітаць у горад Мікашэвічы, а дакладней, на РУВП «Граніт». Уражанняў, атрыманых тут, не атрымаеш больш нідзе. Ну, сапраўды, не на кожным жа кроку мы сустракаем велізны гранітны кар'ер! Краявіды — касмічныя. І толькі бадзёрыя БелАЗы, якія працуюць унізе, нагадваюць пра беларускую лакацыю. Кар'ер «Мікашэвічы» — самая вялікая адкрытая горная вырабатка па здабычы будаўнічага каменю ў Цэнтральнай Еўропе. Глыбіня кар'ернай выработкі складае 150 метраў, што на 20 метраў ніжэй за ўзровень Балтыйскага мора. Больш падрабязна пра вытворчасць будаўнічых элементаў, работу прадпрыемства і яго дасягненні раскажуць у музеі, які быў адкрыты ў 2018 годзе. Гэта не проста музей аднаго прадпрыемства, гэта музей прагрэсу чалавечага розуму. Сярод экспанатаў — як прылады працы першабытных людзей, знойдзеныя падчас работы ў кар'еры, так і сучасныя, высокатэхналагічныя машыны. У многіх краязнаўчых музеях Столінскага, Лунінецкага раёнаў ёсць шмат касцей першабытных жывёл. І знойдзены яны менавіта на тэрыторыі «Граніта». Аматарам палеанталогіі таксама будзе цікава ў музеі прадпрыемства. Тут захоўваюцца косці хазарскага слана, старэйшага брата шарсцістага мамата: пад 60-метровым слоем пяску была знойдзена ўнікальная стаянка, дзе спецыялісты выпучылі дзесяць асобін старажытных жывёл. А яшчэ некалькі тысячагоддзяў таму менавіта на гэтых тэрыторыях было мора Герадота. Пра вялізнае возера (ці сапраўды мора) пісаў не толькі Герадот, але і многія сярэдневяковыя географы. На назіральнай пляцоўцы гранітнага кар'ера можна не толькі захапляцца і разважаць аб тым, на што здольны чалавек, а яшчэ і зрабіць выдатныя фотаздымкі.

Варта мець на ўвазе, што на «Граніце» хоць і рады гасцям, але знянацку іх не чакаюць; усё ж такі прамысловы аб'ект. Загадзя запісацца на экскурсію можна на сайце прадпрыемства.

## Дзе шукаць палескую Венецыю?

Недалёка — Тураў, горад, які асацыюецца з беларускай гісторыяй. Так, гэта зусім не Столінскі раён і нават не Брэсцкая вобласць. Але навошта гэтыя ўмоўнасці? Нельга знаёміцца з беларускім Палессем і не пазнаёміцца з Туравам. Тым больш калі пра яго цудадзейныя крыжы і асобу Кірыла Тураўскага ўсе ведаюць яшчэ са школы. Тураўскі краязнаўчы музей — адзін з найстарэйшых музеяў Гомельскай вобласці. Жамчужына экспазіцыі — фундамент старажытнага храма, пабудаванага прыблізна ў другой палове XII стагоддзя. Музей знаходзіцца побач з помнікам Кірылу Тураўскаму. Помнік знакамітаму Златавусту, царква, у якой ён, магчыма, маліўся — і як не ўбачыць на свае вочы?

Нарэшце накіроўваемся ў Столінскі раён. Каб максімальна адчуць каларыт гэтага краю, трэба адразу браць курс на вёску Цераблічы. Галоўная славутасць вёскі — **разьбяр па дрэве Іван Філіпавіч СУПРУНЧЫК.** Яго работы сабраны ва ўнікальным этнаграфічным музеі. Наведваць гэты музей абавязкова з самім Іванам Філіпавічам. Акрамя сваіх работ, ён прадставіць гасцям легенды і паданні роднага Палесся. Зааднo сваёй гаворкай пакажа, які ён, сапраўды палескі дыялект. Здаецца, што ў гэтым музеі час замірае. Для тых, хто прывык усюды бегчы і спяшацца, — абавязковы для наведвання. Зрэшты, спяшацца тут немагчыма, хочацца як мага больш разгледзець і пачуць.

Сустракаюць гасцей музея 16 скульптур — 16 родаў, якія спрадвеку жывуць у Цераблічах. Кожнаму Іван Філіпавіч дае свае характарыстыкі (што, зразумела, адлюстравана і ў скульптурах). «У Барыса шкура, бо дурна натура» — такі дурнаваты, ды не крыўдзіцца; «У Майсея морда, бо натура цвёрда» — вельмі ўпарты. Да Стральцова заўсёды ездзілі паны, я з роду Стральцовых па бацьку, вось і да мяне госці прыязджаюць», — тлумачыць Іван Філіпавіч. Не хаваючы гонару за родны край, мастак адзначае, што гэтыя роды і сёння жывуць у Цераблічах, і шчыра кажа, што за дзесяцігоддзі яны не вельмі змяніліся. Сямейная тэма працягваецца і асабістай гісторыяй Івана Філіпавіча. Шмат скульптур ён прысвяціў сваёй маме, бацьку, які не вярнуўся з фронту Вялікай Айчыннай вайны, успамінам юнацтва. Майстар захаваў многія рэчы са свайго дзяцінства і сёння паказвае, як палеская вёска жыла ў мінулым стагоддзі. Аднак, ва ўчарашнім дні Іван Філіпавіч не застаецца. Шмат яго скульптур прысвечана сучасным тэмам — развалу Савецкага Саюза, пандэміі, войнам, палётам у космас, Алімпійскім гульням. Праводзіць гасцей ён адметнай мясцовай прымаўкай: «На мядзведзі еду, воўкам падпіраюся, а вужом падперажуся — ды нікога не баюся». Ну дзе яшчэ такое сустрэнеш?





Калі працягваць падарожжа па Палессі на машыне часу, то наступным пунктам маршруту павінен стаць Давыд-Гарадок. Перш за ўсё, трэба, вядома, павітацца з гаспадаром горада, князем Давыдам, унукам Яраслава Мудрага. Помнік заснавальніку горада размешчаны на цэнтральнай плошчы. Абавязкова трэба паглядзець на старажытны храм — драўляную Юр'еўскую царкву, пабудаваную ў 1648 годзе, а затым перабудаваную ў 1724-м. Гуляючы па Давыд-Гарадку, варта глядзець не толькі навокал, але і пад ногі. Некаторыя вуліцы тут выбрукаваныя шасцігранннай «косткай». Дарэчы, вядомы аматар Палесся Уладзімір Караткевіч назваў Давыд-Гарадок «пагарынскай Венецыяй». Масты над Гарынню сапраўды ўражваюць сваёй маляўнічасцю.

## Цэнтр настальгічнага турызму

Па дарозе ў Столін неабходна заехаць ва ўрочышча Стасіна. Гэтае месца — сведка самага страшнага перыяду ў гісторыі як Палесся, так і ўсёй краіны. Тут у гады Вялікай Айчыннай вайны было знішчана 12,5 тысячы чалавек — дарослыя і маленькія яўрэі, беларусы, рускія, украінцы. Брацкай магілай для іх стаў вялізны катлаван, выкапаны яшчэ да вайны для будучага аэрадрома. Самыя масавыя расстрэлы адбыліся тут 11-12 верасня 1942 года, калі карнікі знішчылі яўрэйскае гета. Не пашкадавалі нават дзяцей — больш за 3,5 тысячы. Пасля вайны на магіле ўзвялі абеліск. У пачатку 1990-х устанавілі скульптурную кампазіцыю ў выглядзе дзвюх тужлівых жанчын. Ад Кіеўскай іудзейскай абшчыны пазней устанавілі помнік у выглядзе разгорнутай кнігі. Па ініцыятыве Столінскага райвыканкама месца пахавання добраўпарадкавалі. А арка ў выглядзе трох пар узнятых да неба рук нагадвае аб тым, што тут знайшлі свой апошні прыстанак ні ў чым не вінаватыя мужчыны, жанчыны і дзеці.

Не толькі жудасныя, але і шчаслівыя падзеі, якія адбываліся на Століншчыне ў розныя часы, добра памятае парк «Манькавічы», закладзены ў 1885 годзе Марыяй Даротай дэ Кастэлян, жонкай Антонія Радзівіла. У XIX стагоддзі ў Століне размяшчалася адна з рэзідэнцый знакамітага роду Радзівілаў. Стары дуб, узрост якога больш як 200 гадоў, паказвае на месца, дзе калісьці стаяў шыкоўны палац. Ён быў пабудаваны для Станіслава Радзівіла ў стылі неабарока. Пасля гібелі князя рэзідэнцыя перайшла да яго пляменніка Караля Радзівіла, вялікага аматара палявання. Дзякуючы яму ў палескіх лясах каля Століна адпачывалі і палявалі многія арыстакраты Польшчы і Еўропы. На тэрыторыі парку працуе мясцовы краязнаўчы музей. Яго экспанаты расказваюць гісторыю Століна: тут гарманічна спалучаецца быт вясковых палешукоў і арыстакратычных Радзівілаў.

У сучасным Століне захавалася старажытная планіроўка вуліц з невялікімі дамамі. Амаль у цэнтры горада захаваліся руіны сінагогі. Яна была пабудавана ў далёкім 1792 годзе ў стылі барока, гэта рэдкі помнік сінагагальнай архітэктуры XVIII стагоддзя. Нават па руінах можна ўявіць, наколькі шыкоўным калісьці быў гэты будынак. На сценах захаваліся рэшткі традыцыйнага роспісу. Праўда, убачыць іх няпроста. Каб захаваць тое, што засталося, аконныя і іншыя праёмы, праз якія можна трапіць унутр, закрылі дошкамі. Дому рабіна, што знаходзіцца побач, пашанцавала больш, чым сінагозе, ён захаваўся. Праўда, па прызначэнні сёння не выкарыстоўваецца. Але ў горадзе жыве легенда, што ў сценах дома схаваны скарб — рэчы столінскіх яўрэяў, якія яны прынеслі рабіну на захаванне, пакідаючы горад.

## Там жыве гісторыя

На Століншчыне можна сустрэцца і з жывой, некранутай гісторыяй. Для гэтага трэба ўзяць курс на Альманскія балоты. Гэта самы буйны ў Еўропе леса-балотны комплекс агульнай плошчай 94 тысячы гектараў. На тэрыторыі Альманскіх балот расце 678 відаў раслін, цудоўна сябе адчувае 151 від птушак. Каб было зручна і чалавеку, і прыродзе, пракладзена экалагічная сцежка. Драўляны насціл працягласцю 1,5 кіламетра прывядзе да незвычайна прыгожага возера Вялікае Засомінае. Можна доўга апісваць, якое тут чыстае паветра, прыгожыя краявіды (асабліва калі падняцца на спецыяльную вышку),адметная атмасфера. Але, шчыра кажучы, ніякія словы тое не перададуць. Трэба ехаць і ўсё гэта зведаць самастойна.

Жыве гісторыя і ў вёсцы Гарадная. Тут акуратна і клапатліва працягваюць традыцыі продкаў — займаюцца ганчарнай справай. Пяць стагоддзяў запар у кожнай хаце гэтай вёскі быў ганчарны круг, які карміў усю сям'ю. Жыхары Гараднoй зараблялі на жыццё пераважна вырабам гліняных рэчаў. І дасягнулі ў гэтым вялікага майстэрства. У 1803 годзе гараднянскія сяляне былі вызвалены ад прыгоннага права і былі пераведзены ў разрад дзяржаўных. Сёння справа гараднянскіх майстроў працягваецца ў мясцовым цэнтры ганчарства. Яго кіраўнік Васіль Казачок стаў лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне».

Століншчына — месца, дзе будзе цікава аматарам прыроды, гісторыі, традыцыйных рамёстваў. Цяпер трэба толькі ўсё гэта сабраць у адзіны турыстычны прадукт і правільна прапанаваць гасцям. Работа ў дадзеным кірунку толькі пачынаецца. І як яе праводзіць, абмеркавалі падчас круглага стала, прысвечанага развіццю турызму ў Лунінецкім і Столінскім раёнах. **Начальнік аддзела якасці і вучэбна-аналітычнай работы Нацыянальнага агенцтва па турызме Ганна ВАШЧЫНЧУК** падкрэсліла, што ў гэтых мясцінах варта зрабіць акцэнт на настальгічным турызме і актыўна ўзяцца за прыродазнаўчыя экскурсіі. Паводле яе слоў, такія экскурсіі адстаюць у многіх рэгіёнах. А ў краі палескіх балот і старажытных лясоў яны проста абавязаны быць — і турысты падцягнуцца.

Падчас круглага стала часта гучалі словы аб тым, што развіццю турызму ў Столінскім і Лунінецкім раёнах перашкаджае аддаленасць іх ад Мінска, ад іншых рэгіёнаў. Таму тут і сэрвіс не такі, да якога прывыклі вопытныя турысты, і месцаў для размяшчэння можа быць мала. Але гэта ўсё можна паправіць. Было б жаданне.

«Мы ўбачылі патэнцыял гэтага краю і што да яго прыкладаецца жаданне людзей сустракаць тут турыстаў. Так, Пінск можа перакрываць Столінскі раён. Але я за тое, каб ён не перакрываў, а каб мы маглі паказаць турыстам яшчэ больш. Калі паедуць турысты, тады і гасцініца будзе працаваць без праблем, а пункты харчавання будуць паміж сабой канкурыраваць. Тут трэба працаваць у двух кірунках, і тады будзе турызм. Гэтаму краю трэба падзякаваць за тое, што ён столькі ўсяго збярог, назапасіў, а наша задача — паказваць яго з самага лепшага боку», — адзначыла **экскурсавод Таццяна ХВАГІНА, аўтар турыстычнага маршруту «Да берагоў Гарыні і Прыпяці».**

А задача турыстаў — убачыць і належным чынам ацаніць усё, чым багатыя гэтыя мясціны.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**
*Брэсцкая вобласць.*

# «Дзеці і ўнукі любяць бабулю здаровую, прыгожую і дасведчаную»

## Як на пенсіі падарожнічаць, вывучаць мовы і рабіць жыццё сваё і навакольных больш яркім?

**Ці рэальна зрабіць сваё жыццё на пенсіі больш цікавым, чым яно было ў маладосці? Збіраць вакол сябе творчых людзей, вучыцца новаму, авалодваць замежнымі мовамі, падарожнічаць, не забываючы пра сад-агарод і дзяцей-унукаў — ці магчыма такое, калі табе 60+? Наша гераіня — прыклад таго, што ўсё гэта і нават больш цалкам можна ўвасобіць.**
**Наталлі БАРТОШЫК з вёскі Гарадзішча Слуцкага раёна хутка споўніцца 60, з іх 39 гадоў яна аддала адукацыі: працавала настаўнікам гісторыі ў вясковых школах, дарэчы, неаднойчы станавілася пераможцай шматлікіх прафесійных конкурсаў. А апошнія тры гады яна на пенсіі, праўда, за гэты час упершыню адправілася ў падарожжа на самалёце, больш актыўна пачала ездзіць па Беларусі, вывучаць этнаграфію, беларускую і замежныя мовы, стварыла «Клуб творчых жанчын вёскі» і яшчэ шмат чаго, каб зрабіць жыццё — сваё і навакольных — больш яркім. Не чужыя ёй і такія радасці, як уласны сад і агарод, а прыезд у бацькоўскі дом дзяцей і ўнучкі — заўсёды свята.**



Наталля БАРТОШЫК падчас этнаграфічнай экспедыцыі.

### Не замыкацца на быце

На пытанне, як заставацца актыўнымі на пенсіі, Наталля Пятроўна адказвае: ніякага сакрэту няма, ёй проста цікава жыць.

— Не трэба замыкацца на агародах, на быце. Я нярэдка назіраю, што ў вёсцы жанчыны выходзяць на пенсію і рэзка старэюць: перастаюць за сабой глядзець, напраўляюцца іператвараюцца ў бясплатную абслугу для мужа, дзяцей, унукаў. І акружэнне не разумее, што мама і бабуля мусіць жыць на пенсіі для сябе, а не толькі для навакольных. Варта крышачку ўключаць здаровы эгаізм, сачыць за здароўем, за сабой, — лічыць суразмоўніца. — Дзеці і ўнукі любяць бабулю здаровую, маладую, прыгожую, дасведчаную. Важна развівацца, падтрымліваць свае кагнітыўныя здольнасці. І, вядома, любіць сябе. Гэта вельмі проста і ў той жа час складана. Палюбіш сябе сама — палюбяць і іншыя.

**Паездкі, ды і іншыя актыўнасці нават на радзіме патрабуюць фінансавых затрат. Наталля Бартошык даўно навучылася правільна вызначаць прыярытэты.**

У школе Наталля Бартошык пачала працаваць з 17 гадоў. Пасля 10 класаў яна паступіла ў Смаленскі філіял Маскоўскага энергаінстытута, але ў сям'і было цяжкае матэрыяльнае становішча, і дакументы прыйшлося забраць. Дырэктар школы прапанаваў папрацаваць піянерважатай. А праз год параіў паступаць на гістарычны факультэт Смаленскага педінстытута.

— Памятаю, як ён сказаў: «Добрая работа — сшыткаў не трэба, карту пад паху і пайшла». І так усё жыццё: і сшыткі правярала, і контурныя карты, — усміхаецца суразмоўніца.

Пасля заканчэння ВНУ Наталля пераехала са Смаленска на радзіму мужа — у Беларусь. Працаваць пачала настаўнікам гісторыі ў Вісейскай школе Слуцкага раёна, праз пяць гадоў яе запрасілі ў Бокшыцкую школу — ужо завучам. Там яна і прапрацавала да выхаду на пенсію.

Наталля Пятроўна — шматразовая пераможца прафесійных конкурсаў. У 2018 годзе яна адзіная ў Мінскай вобласці перамагла адразу ў дзвюх намінацыях: «Найлепшы сайт» і «Найлепшы ўрок з прымяненнем IT-тэхналогій». Выйграла конкурс «IT-мазаіка» Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі. Перамагала ў конкурсе «Настаўнік года» (у 2003 і 2017-м), была ўдзельніцай абласнога этапу ў 2018-м. Пераможца рэспубліканскага конкурсу «Ноўтбук для актыўнага настаўніка» ў намінацыі «Вусная гісторыя» ў 2015-м.

Акрамя таго, была членам творчай рэспубліканскай групы настаўнікаў, членам савета РАНА, шэсць гадоў кіравала метадычным аб'яднаннем настаўнікаў гісторыі, шмат гадоў узначальвала метадычнае аб'яднанне завучаў.



У вёсцы Новая Ніва.

### «Інстаграм», замежныя мовы і планы на кожны дзень

На пенсіі Наталля Пятроўна засталася такой жа актыўнай. З'явілася больш часу на вывучэнне беларускай мовы, на якую яна, дарэчы, перайшла ў «Інстаграме». Атрымала два сертыфікаты пасля курсаў па ўкраінскай мове.

— Ёсць такія агульныя парады: у сталым узросце трэба вывучаць мовы, трэніраваць дробную маторыку і ўжываць пабольш зеленіна, — кажа гераіня.

Праўда, вывучэннем толькі гэтых моў жанчына не абмяжоўваецца.

— На кожны дзень я складаю планы, а ў канцы кожнага тыдня падводжу вынікі. Адну дату пішу па-англійску, унізе — па-італьянску, а тэкст — па-беларуску. Вось нядаўна падводзіла вынікі па трох намінацыях (я шмат вучуся, адна са спікераў падказала): развіццё, бізнес і здароўе. У плане развіцця я, напрыклад, атрымала сертыфікат па ўкраінскай мове B1 і напісала для мясцовай газеты артыкул пра вёску Новая Ніва. Другі пункт — бізнес: арганізавала для тутэйшых жанчын «Вячоркі», грошы, якія атрымала на іх па гранце, правільна размеркавала і дала справаздачу. Трэцяя графа — здароўе. Я стараюся штодзень ездзіць на веласіпедзе, прымаю летні душ, хаджу басанож, раблю кропкавы масаж твару, гімнастыку для ног, гімнастыку па Маі Гагулан. Зімой катаюся на лыжах, — дзеліцца суразмоўніца.

Дарэчы, «Вячоркі» — адзін з нядаўніх праектаў, які правяла Наталля Бартошык для навакольных жанчын.

— У рамках нацыянальнай стратэгіі «Актыўнае даўгалецце 2020—2030» быў арганізаваны курс лідараў залатога веку. Разам з жанчынамі з Крупак я абаранла праект «Фарбуем велікодныя яйкі». Падалася на конкурс грантаў, выйграла, і ў адным са слуцкіх кафэ правяла мерапрыемства «Фарбуем велікодныя яйкі». Прыйшлі 10 жанчын, кожная прынесла яйкі, мы пагутарылі, паспявалі, патанцавалі.

**«Калі сябе шкадаваць, пачынаючы з дзяцінства, можна сесці і плакаць бясконца. Але ўсё ў жыцці варта праходзіць дастойна».**

Прычым такія сустрэчы жанчыны вырашылі працягнуць:

— Было відавочна, што яны хочуць кантактаваць. Я пытаюся: хто быў у карцінай галерэі ў Слуцку? Ніхто. Хто быў у музеі слуцкіх паясоў? Як ні дзіўна, але мясцовыя жанчыны не былі. Вось будучай восенню пачнём хадзіць па культурных мерапрыемствах, — дзеліцца планамі суразмоўніца.

Былых настаўнікаў не бывае — і на пенсіі Наталля Пятроўна ўдзельнічае ў праектах па адукацыі. У ліпені ў рамках летняга анлайн-лагера для педагогаў пад назвай «Разам да поспеху» яна выступіць у якасці гуру-важатай у вэбінары анлайн-сэрвісаў для кантролю і самакантролю навучэнцаў.

**«Пенсія — права не трапіць у статус беспрацоўных, хочам — працуем, хочам — не. І рабіць усё, што ты жадаеш і не паспяваў раней».**

— Гэта мая любімая тэма. Я восем гадоў удзельнічала ў рабоце гэтага лагера як вучаніца. Сёлета рашылася выступіць сама, колькі ж можна вучыцца? — усміхаецца гераіня.

### Пенсія. Неба. Самалёт

Прымае на Случчыне жанчына і госцей з іншых гарадоў. Арганізатар сталічнага клуба «Супрацоўніцтва дзелавых і творчых жанчын» Наталля Хазяева нядаўна прывозіла групу з 10 жанчын ад 70 да 84 гадоў. Наталля Бартошык правяла для іх экскурсію і расказала пра Слуцк, пенсіянеркі наведалі мясцовы музей паясоў.

А вось сваё першае падарожжа на самалёце сама Наталля Пятроўна здзейсніла толькі пасля выхаду на пенсію:

— Я перажывала з-за таго, што сышла са школы, і мае сыны купілі мне пуцёўку на адпачынак у Грузіі. Я першы раз у жыцці ляцела на самалёце, глядзела на зямлю, і думкі мае ўпарадкаваліся, — дзеліцца жанчына.

Пасля была паездка ў Італію ў рамках сацыяльнага праекта «Пенсія. Неба. Самалёт», арганізаванага мінчанкай Марыяй Мунцян.

Паездкі, ды і іншыя актыўнасці нават на радзіме патрабуюць фінансавых затрат. Наталля Бартошык даўно навучылася правільна вызначаць прыярытэты.

— Па-першае, пенсія ў мяне крыху вышэйшая за сярэднюю, бо я працавала ў сельскай школе. Па-другое, працуе муж. У той жа час я эканомная — не набываю ўсё, што вочы бачаць. Шмат чаго вырошчваю сама — у мяне агарод і сад. Садавіну, гародніну, ягады я заўсёды маю на стале, хоць з імі і шмат работы. Вось лаванда пачынае цвісці, хачу яе нарыхтаваць, таксама захапляюся лекавымі раслінамі... Мы з мужам самі будавалі дом, ніхто нам не дапамагаў. Таму па жыцці я чалавек незалежны. Самае галоўнае, на мой погляд, — здароўе, астатняе купім за грошы. А калі не купім — значыць, яно нам і не патрэбна. Няма ў мяне футра — ну і добра. Езджу на веласіпедзе, якому ўжо 29 гадоў, — і мяне гэта цалкам задавальняе.

### Праз поспехі і няўдачы праходзіць дастойна

Кантактуе Наталля з людзьмі, блізкімі па духу — такімі ж актыўнымі і творчымі, як яна сама. І нават стварыла «Клуб творчых жанчын вёскі». Сярод яе сябровак — і ўзроставы беларускія супермадэлі Наталля Прыгажынская, Святлана Чарнова і Наталля Брыкіна.

Ды і сама Наталля зусім не выглядае жанчынай пенсіённага ўзросту.

— Стараюся за сабой глядзець. Ужо 20 гадоў я раз на тыдзень хаджу да касметолага на масаж твару. Стараюся, каб былі манікюр, педыкюр, акуратная стрыжка. За модай сачу не так пільна, яна мяняецца, а ў мяне стыль вечнай студэнткі. Аддаю перавагу зручнаму адзенню — футболка, джынсы, пінжак.

Немалаважны і ўнутраны стан. Хандрыць — гэта не пра нашу гераіню.

— Я не плачу і зусім не сентыментальная. Шмат у жыцці было болю, таму, напэўна, парог адчувальнасці вельмі нізкі. Калі сябе шкадаваць, пачынаючы з дзяцінства, можна сесці і плакаць бясконца. Але ўсё ў жыцці варта праходзіць дастойна. У тым ліку і поспехі. Калі ты нечага дасягнуў, галаву ўніз, пальчыкі сціснуў і забудзь пра свае дасягненні — так я заўсёды казала і сваім дзецям.

Дарэчы, сынам Наталлі 28 і 36 гадоў, абодва яны працуюць праграмістамі. Пакуль у жанчыны адна ўнучка, якой бабуля абавязкова прысвячае час.

Што рабіць, каб жыццё пасля выхаду на пенсію не здавалася скончаным?

— Радавацца, што цяпер мы ні ад кога не залежым, — адказвае Наталля. — Пенсія — права не трапіць у статус беспрацоўных, хочам — працуем, хочам — не. І рабіць усё, што ты жадаеш і не паспяваў раней. Калі працавала, дык не заўважала, што мая вёска Гарадзішча ўжо напалову пустая. Зараз у мяне ёсць час прагуляцца ўвечары ці пракаціцца на веласіпедзе. Раней перажывала, што мне 30 і я такая «старая», а сёлета мне 60 — і я гэтаму радуюся.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН» **9 августа 2022 года** проводит **открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды** недвижимого имущества, находящегося в частной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Коэффициент к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.) | Целевое использование имущества | Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – ОАО «ГУМ»**, тел. 8017 343 10 92, 8029 651 52 89 | | | | | | |
| 1 | г. Минск, ул. Раковская, 32 | 18,24 | 3,0 | 77,06 | Офис, иные виды деятельности по согласованию с арендодателем | Здание до 1917 года постройки (памятник архитектуры), 2-й этаж. В здании имеются: центральное отопление, электроснабжение, холодное водоснабжение, канализация, пожарная сигнализация, телефонизация (оптоволокно). **Срок аренды – 2 года** |
| 2 | г. Минск, ул. Раковская, 32 | 28,28 | 3,0 | 106,81 | Офис, иные виды деятельности по согласованию с арендодателем | Здание до 1917 года постройки (памятник архитектуры), 2-й этаж. В здании имеются: центральное отопление, электроснабжение, холодное водоснабжение, канализация, пожарная сигнализация, телефонизация (оптоволокно). **Срок аренды – 2 года** |
| 3 | г. Минск, ул. Раковская, 32 | 37,81 | 3,0 | 159,75 | Офис, иные виды деятельности по согласованию с арендодателем | Здание до 1917 года постройки (памятник архитектуры), 2-й этаж. В здании имеются: центральное отопление, электроснабжение, холодное водоснабжение, канализация, пожарная сигнализация, телефонизация (оптоволокно). **Срок аренды – 2 года** |
| **Арендодатель – ЗАО «МИРАСИТИ»**, тел. 8 029 142 54 65 | | | | | | |
| 4 | г. Минск, ул. Комсомольская, 8-1Н | 196,20 | 25 евро без НДС за 1 кв. м в месяц (оплата производится в белорусских рублях по курсу НБ РБ на дату оплаты) | 828,10 | Объект общественного питания, торговый объект | Помещение расположено на 1-м и подвальном этаже здания, являющегося историко-культурной ценностью. Находится на оживленной пешеходной зоне. Три входа с улицы. Три санузла, душ. Имеется центральное отопление, водоснабжение и канализация, электричество. Разрешённая к использованию мощность 34 кВт. Электрический бойлер, отдельный счетчик на нагрев. Вентиляция общеобменная с механическим побуждением. Пожарная сигнализация. Возможность обустройства летней террасы. **Срок аренды – 5 лет** |
| **Арендодатель – ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ», тел.** +375173753435, +375291498680 | | | | | | |
| 5 | г. Минск, ул. Ташкентская, 20а | 129,40 | 2,0 | 546,72 | Под любые цели, за исключением розничной торговли продовольственными товарами | Отдельно стоящее капитальное строение 1979 года постройки с подъездными путями. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Наименование – пункт приема стеклотары. Общая площадь здания – 129,4 кв. м. Имеются центральное отопление, электроснабжение, водопровод, канализация, вентиляция естественная. Все необходимые ремонтные работы (капитальный, текущий ремонты) проводятся за счет средств Арендатора по согласованию с Арендодателем, без компенсации затрат Арендодателем. **Срок аренды – 5 лет** |
| 6 | г. Минск, ул. Ангарская, 12 | 211,50 | 2,0 | 893,59 | Под любые цели, за исключением розничной торговли продовольственными товарами | Отдельно стоящее капитальное строение 1978 года постройки с подъездными путями и разгрузочной рампой. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Наименование – пункт приема стеклотары. Общая площадь здания – 211,5 кв. м. Здание имеет огороженную территорию. Имеются электроснабжение, водопровод, канализация, вентиляция естественная. Все необходимые ремонтные работы (капитальный, текущий ремонты) проводятся за счет средств Арендатора по согласованию с Арендодателем, без компенсации затрат Арендодателем. **Срок аренды – 5 лет** |

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22.

Форма торгов – открытый аукцион на повышение начальной цены.

Аукцион состоится **9 августа 2022 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 11 июля 2022 г. по 5 августа 2022 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в аукционе, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в аукционе:**

К участию в аукционе допускаются юридические или физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на указанный текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявления на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), зарегистрированные в журнале регистрации заявлений. Лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

Для участия в аукционе лица, желающие участвовать в нем, подают организатору заявления на участие в аукционе с приложением следующих документов:

• документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет BY15 BLBB 3 012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе по предмету аукциона № ___. Сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов;

• копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования – для юридических лиц или индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;

• копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения – для иностранных юридических лиц.

При подаче заявления на участие в аукционе:

физическое лицо, в том числе индивидуальный предприниматель, желающие участвовать в аукционе, предъявляют документ, удостоверяющий личность;

представитель лица, желающего участвовать в аукционе, предъявляет: документ, удостоверяющий личность; доверенность, за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель; документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенную выписку из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы, подтверждающие полномочия), – если юридическое лицо представляет его руководитель.

Документы, составленные на иностранном языке, должны представляться (предъявляться) с переводом на белорусский или русский язык (верность перевода или подлинность подписи переводчика должны быть засвидетельствованы нотариально).

**Порядок определения победителя аукциона:**

Аукцион проводится в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества, находящегося в частной собственности, утвержденным организатором аукциона (далее – Порядок).

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, шага аукциона. Шаг аукциона устанавливается аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона, названной аукционистом.

Аукцион начинается с объявления аукционистом наименования, места нахождения, краткой характеристики недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион, начальной цены, срока, на который будет заключен договор аренды. После оглашения данной информации аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет первую цену предмета аукциона. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион (далее – победитель аукциона).

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю аукциона.

**Обязанности победителя аукциона (лица, приравненного к победителю аукциона):**

подписать протокол о результатах проведения аукциона в день его проведения;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

